ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 7 (1074) | Субота, 11 лютага 1956 года | Цана 40 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Перадавы. — На слаўным шляху.
М. Садковіч. — Закон руху (1 стар.).
П. Бялькевіч.— Велічныя планы (1 стар.).
Ул. Дадзіёмаў.— Новыя землі (2 стар.).
А. Васілевіч. — Калгасныя агні (2 стар.).
А. Далінін.— Вялікі пісьменнік (3 стар.).
Я. Казека.—Грозная зброя (3—4 стар.).
А. Бутакоў.— Спектаклі нашых гасцей (3 стар.).
П. Васілеўскі.— Героі і час (4 стар.).
З замежнай пошты (4 стар.).

НА СЛАЎНЫМ ШЛЯХУ

14 лютага ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве пачынае работу XX з'езд Комуністычнай партыі Совецкага Саюза. Гэтая знамянальная падзея цяпер у цэнтры ўвагі ўсяго совецкага народа. Роднай партыі працоўныя нашай краіны выказваюць сваю адданасць і любоў. Патрыятычныя пачуцці совецкіх людзей знаходзяць канкрэтнае выяўленне ў іх практычнай дзейнасці. Кожны дзень са шматлікіх заводаў і фабрык, ад работнікаў калгасных палёў і МТС паступаюць звесткі аб працоўных подзвігах у гонар партыйнага з'езду.

Якія гэта слаўныя звесткі! Колькі ў іх сапраўднай народнай любві!

Совецкія людзі ганарацца сваёй партыяй, бо з яе імем, з яе дзейнасцю звязаны і няспынны рост эканамічнай магутнасці краіны, і далейшае паляпшэнне добрабыту народа, і небывалы росквіт культуры, і новыя адкрыцці ў навуцы.

Пад кіраўніцтвам партыі наша дзяржава дамаглася значных поспехаў і ў галіне знешняй палітыкі. Мы з радасцю гаворым аб умацаванні дружалюбных сувязей Совецкага Саюза з краінамі народнай дэмакратыі, з вялікай Кітайскай Народнай Рэспублікай. Прыемна адзначыць тое, што нам удалося ўзнавіць нармальныя адносіны з Югаславіяй.

Апошнія месяцы мінулага года прынеслі новыя радасныя весткі. У выніку паездкі таварышаў Н. А. Булганіна і Н. С. Хрушчова па краінах Азіі ўмацаваліся сяброўскія сувязі з народамі Індыі, Бірмы, і Афганістана. Наша палітыка неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, падтрымка нацыянальна-вызваленчай барацьбы народаў Азіі і Афрыкі знаходзяць шырокі водгук у каланіяльных краінах. Мы наглядна ўбачылі, наколькі за апошнія гады вырас у вачах простых людзей свету міжнародны аўтарытэт Совецкага Саюза.

Перыяд, які прайшоў пасля XIX з'езду партыі, вельмі багаты значнымі падзеямі і ва ўнутраным жыцці нашай краіны. Комуністычная партыя, нястомна клапоцячыся аб далейшым павышэнні добрабыту народа, правяла рад мерапрыемстваў, накіраваных на далейшае развіццё і ўкараненне новай тэхнікі, зніжэнне кошту будаўнічых работ, павелічэнне прадукцыйнасці працы і ўзняцце ўраджайнасці калгасных палёў. Гіганцкі размах атрымала работа па асваенню мільёнаў гектараў цалінных і абложных зямель, з якіх краіна дадаткова атрымала мільярды пудоў збожжа.

Знамянальным фактам з'явілася і тое, што мы першыя ў свеце пабудавалі электрастанцыю, якая працуе на атамнай энергіі, прадэманстраваўшы тым самым міралюбны характар нашай навуковай работы ў гэтым кірунку.

Да свайго XX з'езду Комуністычная партыя прыходзіць з велізарнымі дасягненнямі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Вельмі радасна адзначыць, што планы пятай пяцігодкі наш народ выканаў паспяхова. Узорнае выкананне гэтых планаў падрыхтавала нашаму народу ўсе неабходныя ўмовы, каб у бліжэйшы час не толькі дагнаць, але і перагнаць найбольш развітыя капіталістычныя краіны па вырабу прадукцыі на душу насельніцтва. Грунтуючыся на дасягненнях нашай краіны і ўлічваючы шматгадовы вопыт, ЦК КПСС у праекце Дырэктыў XX з'езду так сфармуляваў нашы галоўныя задачы ў шостай пяцігодцы: **«... на базе пераважнага развіцця цяжкай прамысловасці, няспыннага тэхнічнага прагрэсу і павышэння прадукцыйнасці працы забяспечыць далейшы магутны рост усіх галін народнай гаспадаркі, ажыццявіць круты ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці і на гэтай аснове дабіцца значнага павышэння матэрыяльнага добрабыту і культурнага ўзроўню совецкага народа».**

Пачэсныя і велічныя задачы! Яны знамянуюць гіганцкі размах работ па будаўніцтву новых магутных электрастанцый, прадпрыемстваў, па стварэнню і выкарыстанню самай перадавой тэхнікі, па далейшаму магутнаму ўздыму вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў, паляпшэнню добрабыту народа, далейшаму ўздыму яго культуры.

Праект Дырэктыў XX з'езду КПСС атрымаў усеагульнае адабрэнне. У час абмеркаванняў яго работнікі фабрык і заводаў, калгаснікі і інтэлігенцыя ўносілі канкрэтныя прапановы, накіраваныя на лепшае выкананне планаў шостай пяцігодкі.

Наперадзе шырокае поле дзейнасці, шырокі прастор для праяўлення творчай ініцыятывы, працоўнага гераізму.

Новыя справы совецкіх людзей патрабуюць і новага слова, новых твораў ад пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў і майстроў сцэны! Іх абавязак — ва ўсёй велічы паказаць тытанічную стваральную працу народа, выявіць у яркіх вобразах і асаблівасці нашага часу і гераічныя высакародныя характары тых людзей, якія зробяць велічны план явай жыцця.

Мы разумеем, што творчая работа літаратараў і дзеячоў мастацтва не знаходзіць лічбовага адлюстравання ў планах. Але гэта не азначае, што яна ўвогуле не павінна планавацца і накіроўвацца. Пульс кожнай творчай арганізацыі павінен біцца сугучна пульсу ўсяго жыцця краіны.

Аб'ектыўна ацэньваючы свае творчыя здабыткі, мы павінны адкрыта і шчыра сказаць, што знаходзімся ў вялікім даўгу перад нашым гераічным народам. Яркія працоўныя справы мужных будаўнікоў комунізма не знайшлі яшчэ ў нашых творах адпаведнага адлюстравання. У жыцці ўсё выглядае і больш велічным і больш прывабным. Вось чаму па-ранейшаму задача стварэння вобраза станоўчага героя—нашага сучасніка — з'яўляецца самай надзённай задачай.

Выходзячы з новых патрабаванняў часу, творчыя саюзы ўжо цяпер павінны так расставіць свае сілы, каб ахапіць усе бакі шматграннага жыцця. З гэтай мэтай патрэбна больш разумна і больш мэтанакіравана выкарыстоўваць творчыя камандзіроўкі, пасылаць у першую чаргу тых таварышаў, якія вырашаюць найбольш важныя праблемы.

Практыка мінулых год паказала, што самым адсталым участкам у нашай літаратурнай і мастацкай дзейнасці з'яўляецца адлюстраванне жыцця рабочага класа. Трэба прыкласці ўсе намаганні, каб у новай пяцігодцы ліквідаваць гэтае адставанне і ў яркіх творах паказаць тую высакародную ролю, якую адыгрывае рабочы клас у выкананні пастаўленых задач.

У сваю чаргу мы не павінны аслабляць увагі да спраў калгаснага сялянства, работнікаў МТС, а таксама да спраў тых людзей, якія ў шырокіх маштабах будуць праводзіць работы па асушэнню балот Палескай нізіны.

Дастойнага мастацкага ўвасаблення чакаюць і вобразы комуністаў — арганізатараў нашых перамог. Трэба заўсёды памятаць, што на выкананне самых адказных і самых складаных задач партыя пасылае сваіх верных сыноў. На практычнай рабоце, пераадольваючы шматлікія цяжкасці, росціць і загартоўвае партыя свае кадры. Увасобіць у творах гэтую складаную работу — значыць стварыць жывыя, поўнакроўныя вобразы герояў, дзейнасцю і справамі якіх будуць захапляцца мільёны совецкіх людзей.

Для адлюстравання штодзённых спраў народа на пярэдні край павінны выйсці нарысісты — разведчыкі тэм і вобразаў. Але было-б аднабаковым, калі-б мы арыентавалі дзеячоў мастацтва і літаратуры толькі на творы малых форм. Адлюстраваць ва ўсёй рознастайнай велічы і паўнаце нашы справы можна толькі ў творах буйных памераў: раманах, паэмах, аповесцях, операх, сімфоніях, значных эпічных палотнах. Гэтым формам належыць галоўнае месца ў нашым творчым жыцці. І ім павінна быць аддадзена наша галоўная ўвага.

Комуністычная партыя заклікае ўвесь совецкі народ выканаць і перавыканаць заданні шостага пяцігадовага плана. Справа гонару творчых работнікаў — сваёй дзейнасцю дапамагчы партыі і народу ў выкананні намечаных планаў.

Совецкія людзі ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі яны здзейсняць велічныя заданні і запішуць у летапіс сваёй любімай Радзімы слаўныя старонкі новых працоўных подзвігаў.

У рэдакцыю газеты „Літаратура і мастацтва"

Прыношу самую глыбокую і сардэчную падзяку ўсім арганізацыям і асобам, якія прыслалі віншаванні ў сувязі з маім сямідзесяціпяцігоддзем і прысваеннем мне звання Героя Совецкага Саюза.

К. ВАРАШЫЛАЎ.



Кастусь КІРЭЕНКА

Слова аб партыі

Яна, як руплівая маці,
Сыноў у шляхі выпраўляе.
Яна, як сястра дарагая,
З братамі ў жыцці размаўляе,
Яна, як друг самы верны,
Сяброў падтрымае заўсёды,
Яна, як настаўнік, бо вучыць,
І крочыць з намі ў паходы.

У справе малой ці вялікай
Заўжды яна нам як таварыш,
Заўжды яна знае і чуе,
Аб чым у нас думы і мары,
І ў дзень, калі нашыя сэрцы
Захмарацца нейкай трывогай, —
Чыёй мы былі сагрэты —
Як не яе — дапамогай?

Яна — гэта нашы надзеі
І светлыя нашы ўспаміны,
Яна — гэта мужная праўда
І мужная слава краіны,
Яна — гэта мы:
народа
Свайго баявыя мільёны,
І радасна быць нам байцамі
Роднай магутнай калоны!

Заўсёды і ўсюды з партыяй,
Сэрцам і думкамі з ёю!
Ідзём —
Непарушнай і дружнай,
Працоўнай, шчырай сям'ёю.
Ідзём —
Будаваць плаціны,
Зямлю ўпрыгожваць садамі,
Ідзём —
Узняцца да сонца
Будучыні гадамі!

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

УРАЧЫСТЫ ДЗЕНЬ

Для тысяч і тысяч людзей на зямлі
Дзень лютаўскі стане ўрачыстым.
На з'езд свой дваццаты
У маскоўскім Крэмлі
Збіраюцца комуністы.
І ўсе мы —
Рабочы, шахцёр, інжынер
Там думкамі, сэрцам, душою
У светлай крэмлёўскае залі цяпер
З партыяй роднай сваёю.
Яна, наша партыя, —
Маці усім.
З нас кожны жыццё ёй даверыў,
У светлае заўтра
Сынам сваім
Яна расчыніла дзверы.
Ёй руплівіць штодзённа
Пра кожнага з нас —
Пра воіна, што на вучэнні,
І пра комсамольца,
Які ў гэты час
На стэпы ідзе ў наступленне,
Пра тых,
Хто на полюсе з сіламі бур
Упарта змагаецца сёння, —
Яна ўсім народам паказвае курс.
Шлях партыі —
Шлях мільёнаў.
Таму назаўсёды
Мы з ёю усе
Пад сцяг яе сталі агністы.
Бо мір і свабоду
Зямлі ўсёй нясе
Партыя комуністаў.

ЗАКОН РУХУ

Першы год шостай пяцігодкі.

Ужо ў яго абрысах відаць той напрамак, па якім пойдзе наша гаспадарка ў бліжэйшыя пяць год. Ужо цяпер відаць тыя новыя магчымасці развіцця матэрыяльных і духоўных сіл Беларусі, якія забяспечаць паспяховы рух наперад.

Добра пачаўся гэты год. Нібы абноўленая пад іскрыстым снегам ляжала сонечная зямля і над ёй — блакітнае, яснае марозное неба. У гэтыя дні сталіца рэспублікі прымала выбраннікаў народа. Сярод іх — многа знаёмых людзей, чые імёны не раз з'яўляліся на старонках газет, як подпісы пад рапартамі аб выкананні дзяржаўных заданняў ці ў тэкстах карэспандэнцый аб новых метадах выкарыстання механізмаў, аб слаўных дасягненнях на калгасных палях, у лабараторыях інстытутаў, у школах...

Яшчэ не паспелі раз'ехацца дэлегаты XXII з'езду Комуністычнай партыі Беларусі, а ўжо прыбылі ў Мінск дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Так атрымалася, што сесія Вярхоўнага Совета з'явілася якбы натуральным працягам з'езду партыйнай арганізацыі рэспублікі.

Чалавека, які пабываў на з'ездзе і затым прыняў удзел у рабоце сесіі Вярхоўнага Совета, ні на хвіліну не пакідала пачуццё радасці і натхнення, народжаных веліччу нашай краіны.

Безумоўна, дзеячы літаратуры і мастацтва рэспублікі за апошнія гады зрабілі нямала. Аб гэтым гаварылася і на з'ездзе і на сесіі, аб гэтым пісалася ў артыкулах, апублікаваных у дні з'езду. Нязмерна ўзнялася культура беларускага народа.

І ўсё-ж яе дасягненні не могуць поўнасцю задаволіць патрэбы народа. Задавальненне гэтых новых патрэб культуры прадугледжваецца ў новым пяцігадовым плане.

Як вядома, у праекце Дырэктыў XX з'езду, у раздзеле, прысвечаным культуры, вялікае месца адведзена кінематаграфіі. Совецкае кіномастацтва ў канцы пяцігодкі павінна даваць штогод 120 мастацкіх фільмаў. Няцяжка зразумець, што такі аб'ём кіновытворчасці не можа быць ускладзены толькі на студыі Масквы і Ленінграда. Значная доля гэтага плана павінна быць забяспечана студыямі саюзных рэспублік, у тым ліку і студыяй «Беларусьфільм».

Значыць, нам неабходна да канца пяцігодкі падвоіць выпуск мастацкіх фільмаў. Прычым, такіх, якія па сваіх ідэйна-мастацкіх якасцях маглі-б паспяхова спаборнічаць з лепшымі кінокарцінамі саюзных рэспублік.

Вырашыць гэтую задачу павінен не толькі калектыў беларускіх кінаработнікаў, але і беларускія пісьменнікі, мастакі, кампазітары, артысты. Студыя перш за ўсё павінна быць забяспечана добрымі сцэнарыямі, дакарацыі павінны быць зроблены без скідак на «слабасць мінскай тэхнікі», музыка ў фільмах павінна быць поўнагучнай і эмацыянальнай, нарэшце, у беларускіх фільмах павінна здымацца больш беларускіх акцёраў. Але тут сустракаюцца і паўныя цяжкасці. У чым?

Кожнаму павінна быць ясна, што без пастаяннага прыцягнення тэатральных творчых сіл беларускае кіномастацтва ў цяперашні час паспяхова развівацца не можа. Што-ж неабходна зрабіць? Нам здаецца, што ўжо цяпер трэба падумаць аб арганізацыі ў Мінску новага тэатра, калектыў якога пастаянна і рэгулярна ўдзельнічаў-бы ў фільмах.

Трэба прызнаць, што ў Міністэрстве культуры БССР яшчэ амаль нічога не зроблена ў гэтым напрамку.

У плане бліжэйшага будаўніцтва прадугледжана пабудова некаторых цэхаў будучай вялікай беларускай кіностудыі. У тым ліку і галоўнага павільёна. Але гэта будаўніцтва не аднаго года. Да заканчэння новай студыі неабходна пашырыць магчымасці здымак кінокарцін у Мінску.

Сёлета праводзіцца ўсесаюзны конкурс на лепшыя сцэнарыі, прысвечаны гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Якое тут шырокае поле для беларускіх літаратараў, вопытных і пачынаючых, каб справай адказаць на ўказанне партыі аб павелічэнні мастацкіх фільмаў.

За наступнае пяцігоддзе значна павялічыцца сетка кіноўстановак рэспублікі. У тых гарадах будуць пабудаваны кінатэатры, у тым ліку вялікі кінатэатр з шырокім экранам у Мінску. Па часе будуць абсталяваны шырокаэкранныя ў Брэсце і Гомелі.

Будуецца і пашыраецца кінавідарная сетка. Значныя сродкі выдаткаваны на іншыя аб'екты культуры.

Дзяржаўны бюджэт БССР на 1956 год прадугледжвае сумы на добраўпарадкаванне і абсталяванне дамоў культуры ў больш шырокіх памерах, чым у мінулыя гады.

Наша задача—скарыстаць гэтыя сродкі разумна і своечасова. Аднак, нават пабудаваўшы новыя будынкі, забяспечыўшы іх новым інвентаром, мы вырашым толькі палову важнай задачы. Неабходна ўзняць якасць культурна-асветнай работы ў вёсцы.

Трэба памятаць, што дом культуры, размешчаны ў раённым цэнтры, пасёлку калгасе, — гэта цэнтр усёй масава-палітычнай і культурна-асветнай работы, цэнтр далейшага развіцця самадзейнасці.

Ні ў дзяржаўным бюджэце, ні ў пяцігадовым плане няма артыкула аб развіцці самадзейнасці. Ён выцякае з агульнай задачы павышэння добрабыту і культурнага ўзроўню совецкага народа, якая непасрэдна ставіцца перад намі, работнікамі культуры. Час і нам, дзеячам мастацтва і літаратуры, задумацца над тым, каб лепш прапагандаваць сучасную беларускую літаратуру, творы тэатральнага і музычнага мастацтва. Бліжэй да жыцця павінны стаць і мастакі. Іх работу немагчыма ўявіць без сувязі са сваім народам. Немагчыма і мастацкае выхаванне народа без актыўнага ўдзелу творчай інтэлігенцыі.

У рэспубліцы многа бібліятэк з фондам кніг, але вельмі рэдка пісьменнікі дапамагаюць ім у правядзенні канферэнцый чытачоў, абмеркаванні сваіх твораў і г. д.

Адзінаццаць тэатраў рэспублікі ставяць свае спектаклі пераважна ў буйных гарадоў і амаль ніколі не ўлічваюць планы сваіх выязных спектаклёў. А яны-ж павінны ажыццяўляць шэфства над драматычнымі калектывамі калгасаў і заводаў.

Калі Саюз кампазітараў БССР праявіў некаторую цікавасць да творчасці самадзейных кампазітараў, дык Саюз пісьменнікаў зусім адгарадзіўся ад нагляду за самадзейнымі мастакоў. І невыпадкова, што ў ліку многіх тысяч самадзейных калектываў рэспублікі мы не маем і сотні гурткоў выяўленчага мастацтва.

Майстры культуры павінны ўсімі сілкамі дапамагаць на запрошэнне свайго народа, змагацца плячо ў плячо са сваімі чытачамі, гледачамі, за магутны ўздым культуры і мастацтва народа.

Мікола САДКОВІЧ,
намеснік міністра культуры Беларускай ССР.

Велічныя планы

Беларусь—край балот. Забалочанасць тэрыторыі нашай рэспублікі складае 23,8 працэнта. За гады совецкай улады многае зроблена, каб паставіць гэтыя непрыгодныя землі на службу чалавеку. Да 1956 года асушана і ператворана ва ўраджайныя землі сотні тысяч гектараў балот.

Наступ на балоты працягваецца. Праект Дырэктыў па плану шостай пяцігодкі прадугледжвае дадатковае асушэнне і перабудову асушальных сістэм на плошчы звыш чатырохсот гектараў. Будуць таксама весціся далей работы па асушэнню і асваенню забалочаных зямель Палескай нізіны. Гэта дапаможа вырашыць асноўную задачу сельскай гаспадаркі рэспублікі: павялічыць вытворчасць збожжавых культур у новай пяцігодцы прыкладна ў 2,9 раза.

Беларуская ССР—рэспубліка торфу. Большая частка балот мае магутныя тарфянікі. Таўшчыня залягання торфу ў некаторых месцах дасягае 10,5 метра.

Нястомныя клопаты Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада аб выкарыстанні мясцовых відаў сыравіны далі плённыя вынікі. Цяпер у Беларусі створана магутная высокамеханізаваная тарфяная прамысловасць, якая забяспечвае патрэбы народнай гаспадаркі танным палівам. Заданне пятага пяцігадовага плана значна перавыканана.

Разам з тым здабыча торфу адстае ад народнай гаспадаркі, якая хутка развіваецца і ў якой за апошнія гады ўзрасло ўжыванне прывазнога каменнага вугалю. Таму праект Дырэктыў XX з'езду КПСС па шостаму пяцігадоваму плану прадугледжвае павялічыць здабычу торфу ў 1,8 раза.

Мяркуецца закончыць работы па комплекснай механізацыі здабычы фрэзернага торфу, а таксама па механізацыі здабычы, рассцілу, уборкі і пагрузкі кавалкавага торфу, транспартных балотна-падрыхтоўчых і дапаможных работ.

У Інстытуце торфу Акадэміі навук Беларускай ССР у мінулым пяцігоддзі праведзена значная і цікавая работа па вывучэнню дынамікі воднага рэжыму і вільготнасці торфу верхніх пластоў нізіннага паклаўду ў залежнасці ад ступені яго асушэння. Даследаванні, праведзеныя ў 1951—54 гадах на фрэзерных палях торфапрадпрыемстваў «Рэдкі Рог», «Усяж», «Бярэзінскае», паказалі, што пры сучасным узроўні механізацыі работ абавязковай умовай высокай здабычы торфу з'яўляецца інтэнсіўнае асушэнне палёў. У выніку была распрацавана новая схема глыбокага асушэння фрэзерных палёў для нізінных тыпаў тарфянога залягання. Як паказала вытворчая праверка, гэтая схема дазваляе павялічыць збор фрэзернага торфу на 25 — 35 працэнтаў, знізіць сабекошт здабытага торфу і павысіць прадукцыйнасць машын.

Задача інстытута—працягнуць пачатую работу: распрацаваць новыя схемы інтэнсіўнага асушэння для верхавых тыпаў тарфянікаў.

У новай пяцігодцы асаблівая ўвага будзе нададзена здабычы фрэзернага торфу.

Аднак гэты спосаб не пазбаўлены істотных недахопаў. Галоўныя з іх гэта—вялікая намакаемасць, малая аб'ёмная вага і дрэнная транспартабельнасць, значныя страты пры захаванні (самаўзгаранне).

Даследамі нашага інстытута, а таксама іншых навукова-даследчых арганізацый даказана, што большасць гэтых і іншых недахопаў можа быць ліквідавана, калі тарфяную масу перапрацаваць у асобныя зярняты ці гранулы, г. зн. замест пылападобнага атрымліваць зярністы торф.

У 1955 годзе выпрабоўваліся дзве машыны канструкцыі інстытута, якія даюць палепшаны фрэзерны торф—у выглядзе зярністага паліва. Аднак гэтыя машыны яшчэ недасканалыя. У бліжэйшыя адзін—два гады неабходна ліквідаваць некаторыя канструктыўныя недахопы і даць прамысловасці новыя механізмы для здабычы высокаякаснага зярністага фрэзернага торфу.

Пяцігадовы план прадугледжвае значнае павелічэнне вытворчасці тарфяных брыкетаў. Магутнасць брыкетных заводаў у 1960 годзе складзе 260 тысяч тон. Будзе пабудавана 5 новых заводаў.

У Інстытуце торфу ў 1950—51 гадах распрацавана новая тэхналогія брыкетавання торфу, па якой ажыццяўляецца будаўніцтва торфабрыкетнага завода «Верпялішкі». Даныя праектнай арганізацыі паказваюць, што сабекошт адной тоны брыкетаў на гэтым заводзе павінен быць у два разы ніжэйшым, прадукцыйнасць працы рабочых у два разы вышэйшай, а ўдзельныя капіталаўкладанні зніжаны ў 1,7 раза.

МІНСК. Вуліца Калініна.

Аднак торф—не толькі паліва, якое забяспечвае развіццё нашай энергетыкі і прамысловасці. У СССР штогод газіфікуецца толькі на буйных газастанцыях каля двух мільёнаў тон торфу. Тарфяны газ вельмі высокай цеплатворнай здольнасці спальваецца ў мартэнаўскіх і сталеплавільных печах. Маштабы газіфікацыі торфу растуць з году ў год. Аднак усё-ж яна развіваецца павольнымі тэмпамі і адстае ад патрэб народнай гаспадаркі. Адной з прычын такога становішча з'яўляецца тое, што яшчэ не вырашана праблема выкарыстання тарфяных смол і ачысткі сцёкавых вод газастанцый. Важнасць указаных пытанняў стане яшчэ больш зразумелай, калі ўлічыць, што тарфяная смала з'яўляецца каштоўнай хімічнай сыравінай і нерацыянальнае яе скарыстанне прыносіць штогод страты народнай гаспадарцы на сотні мільёнаў рублёў.

Інстытут торфу на аснове дасягненняў совецкай навукі распрацаваў тэхналагічныя схемы перапрацоўкі тарфяной смалы. Прадугледжаны тры варыянты яе скарыстання. Пры наяўнасці тарфяной смалы не больш пяці тысяч тон на яе дзейнічаюць піролізам (раскладанне арганічных рэчываў пры высокай тэмпературы без доступу паветра). У такім выпадку з адной тоны смалы атрымліваецца каля 400 кубічных метраў газу з высокай цеплатворнай здольнасцю і каля 40 працэнтаў вадкіх прадуктаў, якія скарыстоўваюцца ў якасці фарсункавага паліва.

Для смолазаводаў прадугледжваецца перапрацоўка смалы з максімальнай здабычай хімічных каштоўных рэчываў. Такім чынам могуць быць атрыманы: фенолы—для пластычных мас і дакладнага ліцейнага машынабудавання, антысептыкі—для кансервавання драўніны; дарожна-вяжучыя матэрыялы для асфальтавання дарог, высокакаларыйны газ для бытавых патрэб і іншыя прадукты. Пяцігадовым планам развіцця народнай гаспадаркі БССР прадугледжана будаўніцтва на базе тарфяных смол Гомельскага шклозавода першага смолаперапрацоўчага завода. Тым самым будзе пакладзены пачатак стварэнню ў Беларусі торфахімічнай прамысловасці. Ажыццяўленне будаўніцтва толькі гэтага завода дасць штогоднюю эканомію прыкладна ў 150 мільёнаў рублёў.

Пры газіфікацыі торфу атрымліваецца вялікая колькасць такіх сцёкавых вод, якія атручваюць вадаёмы. Распрацаваная інстытутам тэхналагічная схема ачысткі і абяшкоджання падсмольных вод грунтуецца на здабыванні з іх усіх каштоўных воднарастваральных злучэнняў. Гэта забяспечвае эканамічную рэнтабельнасць схемы і адначасова вырашае такія важныя пытанні, як атрыманне каштоўных хімічных рэчываў.

На наш погляд, у шостай пяцігодцы неабходна пабудаваць па схеме інстытута на Гомельскай газагенератарнай станцыі ўстаноўку для ачысткі сцёкавых вод. Ажыццяўленне гэтага будаўніцтва дазволіць атрымаць каля тысячы тон воцатнай кіслаты і тым самым захаваць штогод каля 60 тысяч кубічных метраў драўніны, якая выкарыстоўваецца для гэтай мэты. Апрача таго, можа быць атрымана каля трох-чатырох тысяч тон сульфатных, які паспяхова скарыстоўваецца хімічнай гаспадарцы.

Торф з'яўляецца каштоўнай хімічнай сыравінай. Таму мы не прыхільнікі карыстання яго толькі ў якасці паліва. Мы стаім за комплекснае энергічнае яго выкарыстанне.

Совецкі Саюз, у тым ліку Беларусь, багаты запасамі высокабітуміназных сланцаў, якія маюць у сваім складзе да адзінаццаці працэнтаў высокакачаснага воску.

У 1953—55 гадах Інстытутам распрацавана нескладаная тэхналагічная схема, якая дазваляе атрымліваць каплаўкі воск. З адной тоны сухога торфу здабываецца ад 6 і больш працэнтаў сырога тарфянога бітуму. Пасля абяссмольвання і ачысткі ён становіцца высокаякасную прадукцыю.

Вытворчая праверка якасці атрыманага воску паказала, што ён знаходзіць шырокае рознастайнае скарыстанне ў народнай гаспадарцы. Тарфяны воск ужываецца для апрацоўкі драўніны пры вырабе [illegible], для паліроўкі металаў і металічных [illegible], крыцяў легкавых аўтамабіляў, скуры, пры вырабе алоўкаў, капіравальнай паперы, абутковых крэмаў, паст, васковых эмульсій і многіх іншых вельмі патрэбных нашай краіне рэчаў.

Будаўніцтва доследна-прамысловага завода па атрыманню воску з торфу прадугледжанае ў Беларусі ў шостай пяцігодцы і з'яўляецца пачаткам стварэння новай прамысловасці.

Сувязь навукі і прамысловасці ў нашай краіне трэба ўсяляк умацоўваць і развіваць у далейшым.

П. БЯЛЬКЕВІЧ,
член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР, дырэктар Інстытута торфу.



МІНСК. Прывакзальная плошча. Фото Ул. Крука.

Будаўніцтва ўстаноў культуры

У Беларускай ССР ідзе будаўніцтва 13 раённых дамоў культуры. Кожны такі дом культуры мае глядзельную залу на 410 месц, чытальную залу, памяшканне для бібліятэкі, а таксама пакоі для работы розных гурткоў. З 13 новых дамоў культуры тры мяркуецца ўвесці ў строй у гэтым годзе: у Петрыкаве, Сапоцкіне і Капылі.

У Мінску ідзе пабудова двух новых кінотэатраў па вуліцах Папаніна і Даумана, якія мяркуецца ўвесці ў эксплуатацыю таксама ў гэтым годзе. Сёлета па Даўгабродскай вуліцы пачнецца пабудова новага двухзальнага кінотэатра. Каля двух мільёнаў рублёў асігнуецца на заканчэнне будынка для мастацкага музея па вуліцы Леніна.

Будзе працягнута будаўніцтва кіностудыі «Беларусьфільм». У гэтым годзе тут намечана закончыць корпус майстэрань і пачаць будаўніцтва галоўнага корпуса.

Культурна-асветныя ўстановы будуюцца ў многіх пунктах рэспублікі: у Лідзе — кінотэатр на 330 месц, у Шклове і Берастовіцах — раённыя друкарні, у радзе гарадоў і гарадскіх пасёлкаў — кніжныя магазіны.

У шостай пяцігодцы будаўніцтва культурных устаноў прыме ў нашай рэспубліцы шырокі размах.

Абсталяванне для Мінскага паліграфкамбіната

Мінскі паліграфкамбінат забяспечваецца самым навейшым сучасным абсталяваннем. З Масквы атрыманы травільныя машыны, са Шчэрбакова і Ейска — друкарскія, Ленінграда — лінатыпы, Шчадрынска — прэсы, Одзсы — фотаапараты «ФБ» і «ФГ». Усяго ўжо атрымана машын прыкладна на шэсць мільёнаў рублёў. Гэта складае палову ўсяго вытворчага абсталявання, якое павінна прыбыць на камбінат.

Разгарнулася падрыхтоўка кадраў паліграфістаў. У Мінску, Маскве, Ленінградзе для новай беларускай фабрыкі кнігі рыхтуецца каля 200 чалавек.

Новы сельскі клуб

Напярэдадні XX з'езду КПСС у вёсцы Старое Закружжа Беткаўскага раёна вырас новы прыгожы будынак сельскага клуба. У ім ёсць добра абсталяваная сцэна, прыгожае фае, глядзельная зала на 300 месц. У новым клубе размешчана бібліятэка, працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці, рэгулярна дэманструюцца кінокарціны, наладжваюцца канферэнцыі чытачоў, лекцыі і гутаркі. Гэта ўжо другая культурна-асветная ўстанова, пабудаваная ў сельгасарцелі імя Калініна.

Н. УДОДАЎ.

Любімае месца адпачынку

Кожны, хто праязджаў па шашы Лепель — Віцебск, звяртаў увагу на прыгожы двухпавярховы будынак з мастацкі ўпрыгожаным франтонам. Гэта клуб перадавой у Лепельскім раёне сельгасарцелі імя Леніна.

Клуб з'яўляецца любімым месцам адпачынку калгаснікаў. У ім ёсць глядзельная зала на 400 месц, чытальня, бібліятэка, некалькі пакояў для работы гурткоў мастацкай самадзейнасці. Тут два разы ў тыдзень дэманструюцца кінофільмы, рэгулярна чытаюцца даклады, праводзяцца гутаркі.

З дапамогай агранома Л. Каранеўскага ў клубе абсталяваны агракабінет.

У адным з пакояў размясціўся радыёвузел. Па радыё часта наладжваюцца выступленні калгаснага хору і перадавікоў арцельнай вытворчасці.

Г. ПАЛІКАРПАЎ.

НАРЫС

Новыя землі

Ул. ДАДЗІЁМАЎ

Вестку аб праекце Дырэктыў XX з'езду КПСС па шостаму пяцігадоваму плану мы ўпершыню пачулі ў тых самых мясцінах Палескай нізіны, дзе гэтымі Дырэктывамі прадугледжаны вялікія работы па далейшаму асушэнню і асваенню новых зямель.

У калгасе імя Сталіна Моладаўскага сельсавета ў гэты дзень сотні людзей наводзілі парадак на сваёй калгаснай зямлі — ачышчалі сенажаці ад хмызняку, купін. А непадалёку працаваў кустарэз.

— Цудоўны кадр! — захапляўся кіноаператар, які прыехаў у калгас. — Людзі. Тэхніка.

— А ў «Большэвіку» карчавальнік працуе, у Стральні — два экскаватары і бульдозер, — «распальваў» кіноаператараў дырэктар машынна-меліярацыйнай станцыі Мікалай Кірылавіч Паскробка,— «галоўны меліяратар», як яго тут завуць. — Кадры, а?

І вось неўзабаве паскробкінскі «газік» спыніўся на ўскраіне вёскі Дружылавічы — цэнтра калгаса «Большэвік». Кадр прасіўся на плёнку. Магутны трактар цягнуў за сабой карчавальнік.

— Кадр, а? Тэхніка на асваенні новых зямель! — задаволена ўсміхаўся Паскробка, маўляў, я хоць і меліяратар, але і ў кіномастацтве разбіраюся.

Карчавальнік пераязджаў на новы ўчастак. За ім, нібы на тым урачыстым шэсці, крочылі кіноаператары, галоўны меліяратар, старшыня калгаса... Вось ужо трактар уз'ехаў на ўчастак, вось карчавальнік наблізіўся магутнымі сківіцамі да сваёй ахвяры — вялізнага карча, кіноаператар, узабраўшыся на нейкую купіну, націраліўся апаратам, стаіўся — «ну, яшчэ, яшчэ крышачку», — але ў гэты момант купіна пачала паўзці з-пад ног аператара і, ледзь толькі той паспеў адскочыць у бок, як яна знікла пад вадой. Пазней старшыня калгаса «Большэвік», жартаўнік і аптыміст Пётр Рыгоравіч Алампіеў сцвярджаў, што ў гэты момант корч паказаў машыне язык — «ну што, схапіла» і, крыкнуўшы Мікалаю Кірылавічу: «Прывітанне пакарыцелю балот», даў нырца пад ваду. Кадр не ўдаўся.

— Не, а вы здыміце, здыміце, — смяяўся Алампіеў. — Галоўнаму меліяратару на ўспамін.

— Кадр, а? — злаваўся Паскробка. — Тут-жа балота! Чаму не сказаў?

— Гаварыў, Кірылавіч, — спакойна адказаў Алампіеў. — Сам-жа даводзіў — «глупства».

І, быццам працягваючы толькі што спыненую размову, спытаў:

— Можа асушыш? Каб зноў у балота не трапіць.

— Асушыш! Мала я асушыў!

— Каму многа, а каму і мала. Сам ведаеш — мне-б гектараў дзвесце. Во як трэба... — Алампіеў зрабіў шматзначны жэст рукой — «дазарэзу трэба».

— Зноў ты, Алампіеў, за сваё. Не магу. План. Разумееш — п-л-а-н!

— Дык і ў мяне-ж план. Хлеб, мяса, малако.

— Пішы ў міністэрства. Уключаць у план — асушым.

— Эт, — махнуў рукой Алампіеў. — Пісалі ўжо!

Тым часам трактар пераехаў на іншы ўчастак. Непадалёку сінеў лес, злева раскінуліся майстэрні Дружылавіцкай МТС. Кіноаператар, моцна расхваляваны першай няўдачай, зноў павесялеў. Праўда, і тут Алампіеў крыху закрануў самалюбства Паскробкі. І другі корч ледзь было не сапсаваў святочнага настрою Мікалая Кірылавіча.

— Можа дапамагчы? — зноў засмяяўся Алампіеў. — У мяне тут ёсць цётка адна — ураз вырве.

Паскробка не на жартачкі раззлаваўся. Ён бегаў ад карча да трактара, ледзь было не ўскочыў у кабіну, але трактар, як кажуць спартсмены, зрабіў трэцюю «спробу» — і корч развітаўся з зямлёй. І — найшло, найшло. «Галоўны меліяратар» пераможна глядзеў на Алампіева:

— Я-ж казаў. Кадры! На поўнаметражны хопіць!

Добры настрой вярнуўся да Паскробкі. Пакуль кіноаператары займаліся здымкамі, мы пачалі спакваля «адваёўваць» ад іх «галоўнага меліяратара».

— Інтэрв'ю, значыцца? Можна. Хоць Алампіеў і крыўдзіцца на мяне, але зробленага не адбярэш... Коля, Коля, — раптам крыкнуў ён да трактарыста, — управа бяры. — І, зноў звярнуўшыся да нас, пачаў расказваць, час-ад-часу на поўслове перапыняючы сваё «інтэрв'ю» практычнымі «парадамі» трактарысту. — Не адбярэш. У яго хіба балота. Глупства. Кропля ў моры. Мы вось дзевяць тысяч гектараў асушылі ў адным толькі раёне. Ды якія балоты! Людзе блізка падыходзіць баяліся. І асвоена многа. Толькі за адзін мінулы год—784 гектары. Там цяпер такія ўраджаі! — дзіва. Можа чулі, якая ў Моталі кукуруза была! З Украіны прыязджалі — дзівіліся. А ў «Горкім» пасля асушэння па дваццаць цэнтнераў пшаніцы ўзялі. З гектара. У «Леніна» ў пяцьдзесят чацвёртым годзе — 700 цэнтнераў кукурузы, 200 цэнтнераў бульбы. З гектара... Коля, Коля, ты ніжэй, ніжэй апускай.

Паскробка, хударлявы, рухавы, не мог устрымацца, каб зноў не падбегчы да трактарыста. Вярнуўшыся, прадоўжыў:

— Гэта толькі ў адным раёне. А наогул мы пяць раёнаў абслугоўваем. Маштабы! Балот — мора! Ды і мы-ж не з голымі рукамі. Тэхніка, ды яшчэ якая! І канавакапальнікі, і экскаватары, і бульдозеры, і карчавальнікі, і кустарэзы. Па ўсіх відах работ заданне перавыканалі.

— А ў «Большэвіку»? — перапыніў яго Алампіеў, які толькі што зноў падышоў.

— Асушылі. Астатняе — не прадугледжана. Зноў ты са сваёй «моськай» лезеш. Вунь у Вісліцы дзесяткі тысяч асушыць трэба.

— Як для каго. А для мяне мой «моська» — «слон», — адмахнуўся Алампіеў.

— І людзі ў нас — скарб, — адчуўшы, што Алампіеў не збіраецца яго больш «дапякаць», пачаў расказваць Паскробка. — Абавязкова адзначце. Паліўка, Сегень, Курыловіч, Карпук, Дайнека, Новік... Усіх не пералічыш. Па дзве нормы даюць.

«Інтэрв'ю» было перапынена кіноаператарамі. Дамовіўшыся з Паскробкам аб наступнай сустрачы, мы развіталіся з гэтым цікавым, энергічным чалавекам. А на другі дзень у калгас «Большэвік» прыйшлі дзве радасныя весткі. Першую прынесла радыё — перадаваўся праект Дырэктыў XX з'езду КПСС па шостаму пяцігадоваму плану. І панеслася з адной хаты ў другую гэтая хвалюючая вестка аб вялікай праграме далейшага ўздыму народнай гаспадаркі краіны. У канторы калгаса ў гэты дзень не склікалася ніякіх нарад, пасяджэнняў, але людзі адзін за другім заходзілі ў праўленне — хіба ўсёдзіш у хаце, калі такая цікавая падзея адбылася? Як звычайна, усаджваліся на лаўках, закурвалі.

— Чуў?

— А як-жа!

Размаўлялі, распытвалі, выказвалі свае меркаванні.

— І пра нас ёсць?

— Усё пра нас.

— Я разумею... а вось аб Палессі...

— Ёсць. Асушыць усе балоты Палескай нізіны.

— Там не сказана — усе. «Прадоўжыць асушэнне».

— Раз прадоўжыць, то і закончыць.

— ... А хлеба адзінаццаць мільярдаў пудоў будзе. За год. Мяса — у два разы болей, чым цяпер.

— ... Краіна памацнее — і нам паляпшэнне.

Зазваніў тэлефон. Сакратар райкома прасіў паклікаць Алампіева.

— Слухаю, Міхаіл Кузьміч. Тэлеграма? Так. Вось гэта добра.

І, павесіўшы трубку, сказаў калгаснікам:

— Тэлеграма з Мінска прыйшла. Запланавалі нам асушэнне ўсёй забалочанай зямлі.

— Хіба не заплануеш, калі ў праекце Дырэктыў запісана!

Пазней Алампіеў расказваў:

— Гэта, бясспрачна, супадзенне, што ў адзін дзень і Дырэктывы прыйшлі і тэлеграма. Галоўнае — людзі ўпэўнены: запісана ў Дырэктывах — значыцца, будзе выканана. Новая зямля будзе — новае багацце. Тут-жа балот было — нагой не ступіць, асушылі, ачысцілі ад кустоў, ураджайнасць павысілі, на ногі пачалі станавіцца. Ёсць калгасы мацнейшыя за нас, але і мы ў людзі пачалі выходзіць, мільянерамі сталі. Пасеялі летась кукурузу. На тарфяніках. Моцна яна выручыла нас. Сёлета яшчэ больш кукурузы пасеем. Зямлю новую атрымаем, яшчэ весялей справа пойдзе. Асушаць 200 гектараў ды 320 гектараў ад кустоў ачысцім — хлеба колькі будзе, сена. Багацце!

... Новыя землі — новае багацце. Увесь час, пакуль мы былі ў раёне, нас не пакідала адчуванне маштабнасці, грандыёзнасці работ па асваенню новых зямель і тых плённых вынікаў, якія ўжо дасягнуты хлебаробамі. Мы набывалі ў калгасе «Шлях да комунізма». Тут нават у зімовы час не спыняюцца меліярацыйныя работы. Мікалай Кірылавіч Паскробка нездарма агітаваў кіноаператараў паехаць у гэты калгас. Тут сапраўды працуюць два экскаватары і бульдозер. У цяжкіх умовах — зіма ўсё-ж застаецца зімой, у канцы студзеня і на Палессі прыціснулі марозы, — экскаватаршчыкі Васіль Новік і Афанасій Саўчук выкідваюць за змену па 300 кубаметраў зямлі пры норме 200. Па паўтары нормы выконваюць астатнія меліяратары — Козел, Дзенісюк, Парфеявец. У гэтым калгасе ўжо адваявалі ад дрыгвы сотні гектараў зямлі. Былая дрыгва пачала карміць хлебаробаў.

У апошні час у Іванаўскім раёне распачаўся масавы рух калгаснікаў за лепшае выкарыстанне зямлі, за паляпшэнне лугоў і пашы. Толькі ў адным калгасе імя Сталіна Моладаўскага сельсавета вырашана да дня з'езду ачысціць тысячу гектараў сенажацей. Характэрна адзначыць, што ва ўсіх калгасах шырока ўжываюцца меры заахвочвання працы калгаснікаў на паляпшэнні грамадскіх зямель. Так, з ураджаю на ачышчаных сенажацях калгаснікі атрымаюць 30 працантаў сена. Акрамя гэтага, выдаюцца грашовыя премі.

Многае зроблена на новых землях беларускага Палесся. Тысячы гектараў былых балот ператвораны рукой чалавека ў высокаўраджайныя землі.

— Нас вельмі радуе, што ў праекце Дырэктыў запланавана далейшае асушэнне і асваенне зямель Палескай нізіны, — сказаў сакратар райкома Міхаіл Кузьміч Ільінскі. — Работа чакае нас вялікая, грандыёзная.

Трэба зрабіць некалькі папрокаў і ў адрас меліяратараў, і ў адрас міністэрства, і, дарэчы, саміх сябе папракнуць. Слоў няма — многае зрабілі меліяратары. Ім калгаснікі вялікае дзякуй гавораць. І МТС па праву лепшай у рэспубліцы лічыцца. Аднак ёсць у яе рабоце адзін істотны недахоп — планы ў цэлым перавыконваюцца, а ў асобных раёнах, у нашым, напрыклад, работы не даводзяцца да канца. У адным раёне перавыканалі, у другім — недавыканалі, а ў цэлым перавыканалі. Трэба, каб усюды планы перавыконваліся — балоты нікому не патрэбныя. Я ўжо гаварыў Паскробку, чалавек ён разумны, працавіты, абяцаў пакончыць з такой не вельмі прыгожай для перадавікоў практыкай. Ёсць хібы і ў якасці работ. Асушальная сістэма, напрыклад, разлічана на прыём не максімуму вады, а мінімуму.

Ільінкоўскі ўзняўся з крэсла, падышоў да карты, што вісела на сцяне.

— А цяпер наконт Міністэрства меліярацыі. Нешта не атрымліваецца ў нас з імі размовы. Ёсць у нас два калгасы — імя Калініна і імя Мікаяна. Вось тут, бачыце. Хутароў — сотні, зямля — палку кінеш — у балота трапіш. Дзве з палавінай тысячы гектараў балот. Прасілі мы міністэрства — дапамажыце, асушыце. Яшчэ два гады назад праект зацвердзілі, а далей — ні з месца.

Сакратар райкома гаварыў аб тым, што набалела на душы, што хвалюе калгаснікаў. Трэба думаць, што Міністэрства меліярацыі не адмовіць хлебаробам калгаса імя Калініна і імя Мікаяна ў іх вялікім імкненні — атрымаць новыя землі, новае багацце.

Іванаўскі раён,
Брэсцкая вобласць.

МІНСК. Тэатр оперы і балету. Фото Ул. Крука.

У тэатрах рэспублікі

Новыя спектаклі пакажуць у бліжэйшы час тэатры Савецкай Беларусі.

Упершыню на сцэне тэатра оперы і балету будзе выкананы балет «Шчалкуночык» Чайкоўскага (балетмайстар К. Мулер). У тэатры імя Янкі Купалы рыхтуецца прэм'ера «Крэмлёўскія куранты» Н. Пагодзіна (рэжысёр Л. Рахленка). Бліжэйшы спектакль тэатра імя Якуба Коласа—«На крутым павароце» К. Губарэвіча (пастаноўка А. Скібнеўскага). У Дзяжаўным рускім драматычным тэатры БССР імя А. М. Горкага галоўны рэжысёр В. Фёдараў выпускае спектакль «Мяшчане».

Прэм'еры адбудуцца і ў тэатрах, якія працуюць у абласных цэнтрах.

Тэатр імя ЛКСМБ пакажа дзве новыя работы па п'есах савецкіх драматургаў: «Першую вясну» Г. Нікалаевай і С. Радзінскага і «Сініцыны» маладога драматурга Р. Рамана. У Магілёўскім абласным тэатры рыхтуецца пастаноўка «Лёс таварыша» С. Сплашнова і М. Бярозкі. Гомельскі тэатр мяркуе пазнаёміць сваіх гледачоў з новымі спектаклямі «Васа Жалезнова» М. Горкага і «У цихім завулку» А. Маўзона, а Гродзенскі — з «Дачнікамі» М. Горкага.

Новыя спектаклі ствараюцца ў дні, калі ўся краіна рыхтуецца дастойна сустрэць XX з'езд КПСС. Калектывы тэатраў працуюць у гэтыя дні з вялікім творчым уздымам.

Наша бібліятэка

Ужо не чуваць ні бразгання вёдраў, ні скрыпу калодзежнага жураўля, толькі дзе-ні-дзе патрэсквае мароз. Загарэліся ў калгасных хатах ясныя агеньчыкі.

Неўзабаве вясковую цішыню парушаюць вясёлы смех, заўзятая звонкая песня, гукі гармоніка. Гэта моладзь ідзе на агеньчык у нашу бібліятэку.

Трэба ветліва яе сустрэць, аднаму выбраць добрую кнігу, з другім пагутарыць аб прачытаным, іншаму даць параду. Ведаць сваіх чытачоў, іх думкі, жаданні, каб ніхто не выходзіў незадаволеным, на мой погляд, абавязак кожнага бібліятэкара. У гэтым многа дапамагае мне бібліятэчны совет. Не радзей як два разы ў тыдзень мы бываем у брыгадзе, праводзім гутаркі, чытаем у голас найбольш цікавыя матэрыялы з газет і часопісаў. Асабліва жаданым госцем сустракаюць калгаснікі настаўніцу М. Маскалёву.

Нядаўна ва ўсіх брыгадах мы правялі гутаркі аб падрыхтоўцы да вясны, аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, аб уліку і выдаткаванні кармоў. Калгаснікі цікавяцца, як узнікла жыццё на зямлі і іншымі пытаннямі. На тэму «Навука і рэлігія» з імі пагутарыла настаўніца Міхневі.

Калі ёсць актыў, дык з яго дапамогай можна і добраўпарадкаваць бібліятэку, і наладзіць нямала цікавых спраў. У нас многа збіраецца народу на канферэнцыі па кнігах, створаны і працуюць літаратурны гурток, перасоўныя бібліятэчкі. Мы завялі альбом «Чытачы аб кнігах», які стаў маім настольным дапаможнікам. Выпускаем у брыгадах «Бачныя лісткі», арганізуем кніжныя выстаўкі, складаем рэкамендацыйныя спісы. Звычайна я ведаю, каму якую кнігу прапанаваць.

Самае галоўнае ў нашай рабоце — шчыльная сувязь з людзьмі. А кнігу ў вёсцы любяць і чакаюць новых сучасных літаратурных твораў.

Н. СЕКУШЭНКА,
загадчык Асмолавіцкай сельскай бібліятэкі Клімавіцкага раёна.

КАЛГАСНЫЯ АГНІ

Наша вёска здаўна мае дзве назвы. Даніншчына — так заўсёды звалі яе і зацьць цяпер, і Ліпнікі — так усюды пісалі і пішуць яе назву.

Першая назва, успаміналі старыя, пайшла ад прозвішча пана Даманскага, якому належалі некалі тутэйшыя лясы і землі. Яна ў дзяцінстве асацыіравалася ў мяне з чымсьці чорным і загадкавым, такім як стары лахматы лес і непралазнае балота, якія зваліся ў нас таксама Даманшчынай.

Ліпнікі — гэтую назву вёсцы далі першыя яе новасельцы. Прыйшлі яны сюды з сякерамі і піламі, пабудавалі сабе ў маладым ліпняку з пахучага яловага бярвення хаты і вёску таксама назвалі Ліпнікамі. Гэтая назва ў адрозненне ад першай выклікала ў мяне заўсёды нейкае вельмі радаснае, святочнае адчуванне, такое, якое бывае кожны раз, калі ты сустракаеш сонечную раніцу...

Я ўжо не памятаю лучыны ці смалякоў замест лямпы, але як людзі сляпіліся пры пяцілінейцы і як трэсліся над газай — гэта памятаю вельмі добра.

Многа гадоў назад жыў у нашай вёсцы Тодар Гурын, стары і вельмі скупы чалавек. Лета і зіму не скідаў ён з галавы абшэлай «зімовай» шапкі. Усяго і розніцы было, што летам хаваў галаву ў гэтай шапцы ў цянёк, а зімой цэлымі днямі грэўся ў ёй за комінам на печы. Сам гаспадарыць Тодар быў ужо нягож, аднак выпускаць з рук «лейцы» таксама не збіраўся. Жанаты ён быў двойчы. Першая жонка, з якой ён пражыў амаль усё сваё жыццё, памерла, пакінуўшы яму чацвёрых сыноў і дзвюх дачок. Другая жонка, з якой ён пражыў не больш як год, была ўдавой з чатырнаццаці дзяцьмі, з якімі ён і ўзяў яе, — і ўсе яны, як і ўласныя, ужо дарослыя, і ўсе, як і ўласныя, ужо нежанатыя і незамужнімі дочкамі...

Аднойчы, пішучы пра вясковыя навіны, я, як ужо ўспамінала пра нябожчыка Тодара, але няхай чытач даруе мне маё вымуджанае паўтарэнне: маючы намер расказаць пра «даманскія агні», я ніяк не магу абыйтіся, каб зноў не ўспомніць Тодара Гурына з Даманшчыны...

Дык вось. Да Тодара (як і звычайна да таго, хто ёсць незамужняя дочка) часта прыходзілі вясковыя хлопцы і дзяўчаты з прасніцамі, а хлопцы — справа вядомая — прыходзілі з жартаваць ды пасмяяцца...

Сырая, пашкоджаная грыбком Тодарава хата асвятлялася лямпай-пяцілінейкай. За сталом, на покуце і на лавах ад гэтай лямпы было яшчэ, як кажуць, асвяціся: тут можна было і прасці і пруткамі што-небудзь рабіць. У куткі-ж святло не трапляла — так і хуталіся яны вільготнымі поцемкамі. Аднак гэтыя поцемкі зусім не перашкаджалі старому Тодару пільна сачыць за тым, што рабілася ў хаце, не перашкаджалі паказаць яшчэ, калі трэба, сваю ўладу гаспадара і галавы сям'і...

Здаралася часам, што кволы язычок-агеньчык бляшанай пяцілінейкі раптам рабіў нейкі свавольны жарт, ускідваўся ўгору ярчэйшым, чым звычайна, полымейкам і на некаторы час быццам далей у куткі заганяў поцемкі і рабіў хату весялейшай. Тады стары Тодар, трымаючыся аберуч за вышмальцаваны бок старой, як і сам ён, печы, з крэхтам, спіною да хаты злазіў на зямлю і, не звяртаючыся ні да кога, памяншаў агонь.

— Тата, — скажа малодшая і смялейшая Тодарава дачка Волька, — куды вы ўкручваеце гэты агонь, — кудзелі не відно нават.

— Убачыш... Выскаляцца вам цёмна. Агонь высалапілі на ўсю хату... Забыла, што газа грошы каштуе? — ужо карабкаючыся на печ, строга, недзе ў цёмны куток буркне Тодар, і ўсе змоўкнуць. Толькі і чутно, як папярхнецца ад прыдушанага смеху якая-небудзь з дзяўчат ды многазначна падкашляне хлапечы бас... Старога не перапрэш...

... Якіх толькі падзей не адбылося ў Даманшчыне за тыя гадоў трыццаць, як назаўсёды пакінуў яе Тодар Гурын!

Перш-на-перш, на месцы яго сырой, з'едзенай грыбком хаты стаіць новая пяцістенка. Старому век не прыснілася-б, што з хаты можна выкінуць «палкі» (на якіх упокат некалі спала ўся яго сям'я), і паставіць «гараднія» ложкі; можна адмовіцца ад «току» ў хаце і паслаць падлогу; можна паставіць гарадскую шафу, павесіць на ўсю сцяну люстра, а лямпу вынесці «на гару»! І яшчэ аднаму дзіву ніколі не паверыў-бы Тодар Гурын, што надыйдзе такі час, калі не трэба будзе прыслухоўвацца да пеўняў, баючыся заспаць і не ўстаць на досвітку...

... У хаце ўдавы Ігналіхі, лепшай калгаснай ільнаводкі-звеннявой (нявесткі Тодара Гурына), на ўсю хату зіхаціць цяпер электрычная лямпачка. І будзіць Ігналіху не яе гарласты певень, Роўна ў шэсць гадзін раніцы абуджаецца прымацаваная да сцяны чароўная скрыначка, і хату вітае добры зычлівы голас: «Гаворыць Масква! Добрай раніцы!»

Даманшчына ўваходзіць цяпер у склад узбуйненага, багацейшага не толькі на Случчыне, але і ў рэспубліцы калгаса імя Калініна.

Напярэдадні новага года прыйшло да мяне пісьмо ад маіх сваякоў-калінінцаў.

Я не буду «ўпрыгожваць» ні зместу, ні стылю пісьма. Яно не мае ў гэтым патрэбы, а наадварот, будзе вельмі паказальным у многіх адносінах.

Праміну тое, што датычылася нашых асабістых сямейных навін, і пачну з агульнага, чым жыве не толькі мая радня, а ўсе калінінцы.

Вось што мне пішуць:

«... Табе напэўна цікава ведаць, колькі заважыў наш сёлетні працадзень. Вось ён: 8 рублёў грашыма, 5 кілограмаў бульбы, паўтара кілограма збожжа і столькі-ж грубых кармоў.

Ты была ў нас і ведаеш, што мы пабудавалі тыпавы калгасны клуб і канцылярыю. Але ты не бачыла нашых гаспадарчых пабудоў: новых гумнаў, тыпавага каровніка і цялятніка з аўтапаеннем і падвеснай дарогай. Вось дзе, скажам табе, выгода! Палова лішняй работы далоў! Для рэзкі і драблення кармоў на фермах у нас таксама ўстаноўлены электрычныя маторы. А гэта колькі часу эканоміць даглядчыку!

Сёлета на ўсіх фермах мы шырока карыстаемся ўжо такой «навіной», як кукуруза. Яе мы пасеялі 80 гектараў. Як сеялі, сказаць па праўдзе, сумняваліся, ці выйдзе з гэтага што. Хто кукурузу калі сеяў у нас? Хіба якая ўжо вельмі старанная гаспадыня абтыкае, бывае, разоры, ды і то так, для забаўкі дзецям... А вось сёлета ад гэтай самай кукурузы мы на ўсю зіму забяспечыліся кормам для жывёлы. Цяпер ужо, на вясну, будзем ведаць, што рабіць!

... Пяцьдзесят пяты ў нашым калгасе быў вельмі прыдатным у свінагадоўлі. «Калінін» заняў першае месца па рэспубліцы. Семінар спецыяльны быў для жывёлаводаў у нашым калгасе. На 100 гектараў ворнай зямлі ў нас выйшла па 36,8 цэнтнера свініны. Даход немалы!

Ну, а калі растуць даходы ў калгасе — расце і будаўніцтва. Будуем зараз цагляную лазню ў цэнтры калгаса.

Агульнымі сіламі калгаснікаў пачалася ў нас яшчэ адна вялікая і адказная справа — будаўніцтва калгаснай бальніцы. Гэтую справу мы лічым падзеяй больш чым раённага маштабу.

... А пасля таго, як у нас правялі радыё і як у нашых хатах загарэлася лямпачка Ільіча—уяўляеш, 400 двароў электрыфікавалі і радыёфікавалі адразу — усе мы быццам памаладзелі. Не пазнаць людзей! Наперабой адзін перад другім купляюць радыёпрыёмнікі, радыёлы. Хутка, як і ў вас, у горадзе, жанкі завядуць электрычныя прасы і пліткі — і не падступіцца будзе. Ужо і зараз не пазнаць іх. Як раней некалі стараліся адна перад другой больш паставіць і выткаць кроснаў, так зараз навыперадкі старацца кожная купляць гарадскія капы, ручнікі, абрусы...

Пры клубе ў нас свой радыёвузел. Таму зараз ніводная падзея не застаецца ў баку ад калгаснікаў. Кіномеханік прывёз новую карціну — перададуць па радыё. Вечарам нехта з нашых мясцовых лектараў будзе чытаць лекцыю — гэта ўжо заранёй вядома ўсяму калгасу... А здараецца і так: не дагледзела, скажам, якая-небудзь Марыля свінню, і свіння нарабіла шкоды ў калгасным агародзе — у зводцы калгасных падзей і аб гэтым перададуць па радыё. І гэта лепшая мера выхавання і ўмацавання грамадскай дысцыпліны... Гэта табе не проста вымова ў кабінеце старшыні калгаса, а «віншаванне» на ўвесь калгас.

Але гэта толькі сардэйнічае ўмацаванню калгаснай гаспадаркі. Як-ні-як, а мы ў мільянерах лічымся. Мяркуем, прыбытак пяцьдзесят пятага года будзе не менш 3-х мільёнаў...

Прыбытак вялікі, але і справы вялікія і адказныя яшчэ ўперадзе ўсіх нас чакаюць.

Заданні студзеньскага Пленума ЦК КПСС згодна з перспектыўным планам калгаса мы выканаем у 1956 годзе».

Пісьмо гэта міжвольна прымушае мяне зноў азірнуцца некалькі назад, паглядзець, як сапраўды многа зроблена.

Яшчэ да вайны, ледзь не да самых гумен падступала ў нас балота Даманшчына і Кляпчанскае. Летам тут, носячы рэдкую калючую асаку, па пояс грузлі мужчыны, а потым гэтак-жа таплісіся бабы, зграбаючы гэтую асаку. За Кляпчанскім цягнуўся брод Шэндар. Некалі ў гэтым бродзе ўтапіўся анучнік Шэндар. Хацеў за аброць перавесці цераз мосцік каня з возам, а конь праваліўся пярэдняй нагой пад гнілую маснічыну, рвануўся з рук у гаспадара і той не ўтрымаўся, паляцеў у канаву. Каня выцягнулі толькі назаўтра. А чалавек, вядома, загінуў... Толькі броду пакінуў сваё імя: Шэндар...

Шэндар быў пакутай і карай і майго дзяцінства. Цераз гэты брод увосень і вясною нас, школьнікаў, верхам на конях перавозілі ў школу, што знаходзілася ў суседнім сяле Паўстынь... Колькі страху бывала нацерпішся ад гэтага «падарожжа»...

Цяпер ад Даманшчыны да Паўстыня дарога — хоць кацісь. На месцы нядаўніх балот — Кляпчанскага, Даманшчыны і Шэндара блішчаць на сонцы гоні тлустай чорнай зямлі. Якія тут аўсы родзяць, якія буракі растуць!

Калгас імя Калініна два гады ўжо быў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. І многія калінінцы пабывалі ў Маскве на выстаўцы, убачылі Крэмль, Красную плошчу, дзівіліся на цуды маскоўскага метро, на маскоўскія вышынныя палацы... Ды ці мала цудаў у Маскве для свежага чалавека, тым больш, калі ён прыехаў сюды ўпершыню.

Мінулай восенню мне давялося быць у «Калініне», у сваёй роднай Даманшчыне, пасля таго, як там адбыліся па-сапраўднаму захапляючыя змены.

Сабраліся сваякі, суседзі. Ярка гарэла «сотка» (лямпачка ў сто свячэй). Па радыё ішла перадача, прысвечаная Лермантаву. Мы слухалі пакладзеныя на музыку цудоўныя вершы «Выхожу один я на дорогу»...

... Скончылася песня. Нехта з жанок уздыхнуў усімі грудзьмі, нехта на поўголаса божкнуў, а немалады сівы мужчына непрыкметна, рукавом кажуха, змахнуў з няголенай шчакі скупую слязу...

Мае адчуванні ў той вечар можа добра эразумець бадай толькі той, чыё дзяцінства прайшло ў такой-жа звычайнай сялянскай хаце — зімой на гарачым чаране шырокай печы, а вясной і летам да першых асенніх замаразкаў з такімі-ж, як я, басаногімі аднялеткамі, на вуліцы; з пугай і статкам кароў у полі; сярод перасвісту птушак і вятроў у лясных паходах.

... Як сумна, што яшчэ і цяпер — і, на жаль, нярэдка! — можна сустрэць «погляды», калі нашу вёску лічаць мала што ні пустэльняй! Гавораць, што там не спаткаеш чалавека, з якім можна было-б адвесці душу — пагаварыць на «ўзвышаныя тэмы», пагаварыць пра мастацтва і наогул пра ўсё тое, што можна так лёгка па платнаму білету атрымаць у горадзе...

Няпраўда ўсё гэта!

У другі раз расказвалі мне жанкі:

— Паліш раніцой у печы і столькі ўсяго наслухаешся, быццам цэлы свет за раніцу абыйдзеш. Колькі таго часу прайшло, як павыносілі мы лямпы з хат, ды як загаварыла ў нас радыё, а цяпер, каб сказаў хто, што зноў можна без усяго гэтага абыйсціся, здаецца на вочы не пусціў-бы такога чалавека: гэта-ж хоць ты лажыся ды памірай. І як гэта людзі раней век зжывалі ў такой цемры — зараз ужо цяжка ўявіць... Вось як хутка чалавек прывыкае да святла...

Так, вёсцы патрэбна святло! Як мага больш святла! Больш, чым яго ёсць цяпер.

Тады і моладзь не будзе гэтак імкнуцца хоць «абы дзе», абы «прыткнуцца» ў горадзе. Тады і гарадскому чалавеку лягчэй будзе адарвацца ад купленых на білету «муз» і паехаць у вёску.

Вось як ярка і магутна асвятляюць жыццё людзей гэтыя «даманскія агні», ці, больш дакладна: агні калгаснай вёскі!

Алена ВАСІЛЕВІЧ.

Вялікі пісьменнік

9 лютага споўнілася семдзесят пяць год з дня смерці Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага. Пра яго і Л. Талстога М. Горкі сказаў, што гэтыя найвялікшыя рускія пісьменнікі сілаю сваіх талентаў узрушылі ўвесь свет, звярнулі на Расію здзіўленую ўвагу ўсёй Еўропы. Дастаеўскі аказваў, пачынаючы з другой паловы мінулага стагоддзя, усё большы і большы ўплыў на сусветную літаратуру.

У сваёй творчасці Дастаеўскі заўсёды кіраваўся адным імкненнем: быць да канца, да суровасці праўдзівым. Гэтага патрабаваў ад яго той высокі ідэал, з якім ён прыйшоў у літаратуру ў сярэдзіне саракавых гадоў мінулага стагоддзя, незадоўга да рэвалюцыі, што ўзрушыла ўсю Еўропу. Тады «ўладары розуму», рэвалюцыйныя дэмакраты Герцэн і Белінскі верылі ў светлую мару аб «залатым веку», аб новай эпосе ў сусветнай гісторыі.

«О, да іх і з імі! У іх адных ісціна! Буду верны!» — прысягаў тады юны Дастаеўскі гэтым вестунам рэвалюцыйнай думкі. Зачараваны прыгажосцю жыцця, ён таксама быў глыбока перакананы, што «новыя пераможцы свету, буржуа, аказаліся яшчэ можа горш папярэдніх даспатаў», «справа спынілася дарэмна і няправільна, справу патрэбна працягваць, абнаўленне чалавецтва павінна быць радыкальнае, сацыяльнае».

Гуманісты 40-х гадоў XIX стагоддзя абвяшчалі: «Самы занядбаны апошні чалавек ёсць таксама чалавек і называецца брат твой». Гэта патрабавала спачування да занядбанага «меншага брата», але не пачуцця роўнасці з ім. Дастаеўскі і ў самых першых творах сваіх: у «Бедных людях», у «Двайніку», «Слабым сэрцы» і іншых падыходзіць да свайго героя як да роўнага. Ён ведае—і не розумам, усёй істотай сваёй разумее абсалютную вартасць кожнай чалавечай асобы. Для яго перажыванні самага «бескарыснага» чалавека настолькі-ж святыя, недатыкальныя, як і перажыванні найвялікшых дзеячоў, «найвялікшых дабрадзеяў свету гэтага». Дастаеўскі адразу пераносіць цэнтр увагі ў сферу «сэрца», адзіную сферу, дзе пануе роўнасць, дзе кожнае імгненне выключнае, індывідуальнае. Вось гэта і дае яго мастацкаму генію тую велізарную сілу, якая патрэбна, каб узняцца ў абмалёўцы ўнутранага свету самага «малога з малых» да ўзроўню сусветнага, універсальнага.

Гэтаму-ж адпавядае і іншая рыса Дастаеўскага — яго надзвычайная схільнасць да адлюстравання самага напружанага чалавечага душэўнага стану, яго непераадольнае імкненне пераступаць за тую мяжу, за якой мастацкасць губляе сваю змякчаючую сілу. Усе людзі ў яго вельмі індывідуальныя, абсалютна аўтаномныя ў адзіна важнай і каштоўнай для яго галіне—у галіне «сэрца», пачуццяў. І гэта часам паслабляе ўвагу да агульнага фону, да рачаіснасці, якая абкружае чалавека. Чытач быццам прыкаваны да адзінкавага жыцця і часам забывае аб сувязі яго з іншымі. Ён уваходзіць у самыя глыбокія таямніцы чалавечай душы, уваходзіць нават нейкімі абходнымі шляхамі, далёкімі ад звычайнай логікі. І гэта настолькі незвычайна, што, на першы погляд, асобы здаюцца амаль фантастычнымі. Адсюль і самы фон, на якім яны выступаюць—быт, абставіны—таксама здаюцца фантастычнымі. А між тым мы ні на хвіліну не сумняваемся, што перад намі жывая праўда.

І самая страшная праўда, якая пранікае праз ўсё, найвялікшая трагедыя, — гэта непераадольны кантраст паміж шчаслівай будучыняй чалавецтва і яго цяжкім і пакутлівым сучасным; супярэчнасць, якая здаецца ўжо нясцерпнай у параўнанні з высокімі ідэаламі. Гуманізм, прынцыпы ўсеагульнага шчасця, любві і брацтва, гарманічнае жыццё, вырашэнне ўсіх пытанняў,—чым больш цудоўна ўсё гэта, тым больш недапушчальныя тыя ўмовы, якія губяць чалавека.

Гэтая трагедыя была перажыта Дастаеўскім вельмі цяжка ў асабістым жыцці, калі ў канцы саракавых гадоў мінулага стагоддзя зноў узнялася ў Расіі рэвалюцыйная хваля, і ён стаў членам таварыства петрашэўцаў. Урад цара-жандара Нікалая I прысудзіў яго да расстралу, які замянілі ў апошнюю хвіліну, «па царскай міласці», катаржнымі работамі ў далёкай Сібіры—у Омскай турме, пасля выхаду з якой ён быў здадзены ў салдаты.

Усё гэта і адлюстравалася ў творчасці Дастаеўскага пасля звароту з Сібіры, у гады поўнага росквіту яго генія, пачынаючы з яго аўтабіяграфічных «Запісак з Мёртвага дому», кнігі, здзіўляючай па сіле, з якой абмаляваны цэнтральныя яе вобразы. Мэта яе, здавалася-б, старая, «гуманістычная»: выявіць прысутнасць сапраўды чалавечых рыс у сэрцы нават самых заўзятых, вядомых злачынцаў, на ілбе якіх кляймо пагарды. Але глыбокай цікавасцю да душы чалавека прасякнуты ў гэтых «Запісках» карціны, намаляваныя змрочна-суровымі фарбамі.

Перажытае на катарзе і ў салдатчыне адлюстроўваецца ў той ці іншай меры і ў рамане «Злачынства і пакаранне»—адным з самых выдатных твораў сусветнай літаратуры. У ім велізарная разбуральная сіла, накіраваная супраць існуючага ладу, і ў той-жа час накутлівыя пошукі новых форм жыцця, новага грамадства і новага чалавека. Супрацьпастаўлены дзве сістэмы думак, два супрацьлеглыя душэўныя склады: крайні індывідуалізм Раскольнікава і настрой пакорлівасці і любві



Мармеладавай. Раскольнікаў стварае на аснове атэізма сваю тэорыю, сваю этыку, па якой ён дазваляе сабе парушыць асноўныя нормы грамадскіх паводзін; ён далучае сябе да катэгорыі людзей незвычайных, носьбітаў новых ідэй, новых вышэйшых вартасцей і мае не толькі права, але і абавязаны ісці супраць устаноўленых законаў. Дастаеўскі ўкладвае ў гэты вобраз незвычайны па геніяльнасці змест, дзе жалезная логіка думкі зліваецца з найтанчэйшым аналізам чалавечай душы і прыводзіць свайго героя да краху, тым самым выкрываючы ўсю беспадстаўнасць яго шляху, ілжывасць самой асновы яго поглядаў, яго крайняга індывідуалізма.

Але неабгрунтаваны і шлях Мармеладавай—шлях пакорлівасці, веры ў бога—гэтую галоўную аснову яе жыцця, адзіную апору ва ўсіх яе пакутах. Яна пераносіць беднасць, голад, прыніжэнні, здзекі, нікому не пярэчыць, ніколі не пратестуе. Спрадвечная ахвяра, яна можа толькі плакаць.

Так за тэзай і антытэзай праводзіцца сінтэз. У царстве будучыні, у новым грамадстве, у новым чалавеку, які ўжо нараджаецца, павінны быць элементы раскольнікаўскай свабоды, веры чалавека ў сябе, у свае сілы, і—глыбокай любві Мармеладавай.

Гэтая ідэя аб новым чалавеку ў новых формах грамадскага жыцця знайшла сваё ўвасабленне на апошніх старонках рамана ў сне Раскольнікава аб катастрофе, якая напаткае сучасны яму свет. Сон Раскольнікава канчаецца так: калі адбываўся распад чалавечага грамадства, то выратаваліся ва ўсім свеце толькі некалькі чалавек, «чыстыя і выбраныя, якія прызначаны пачаць новы род людзей і новае жыццё»...

Іменна такім уяўляўся Дастаеўскаму ідэальны вобраз, **ідэал-дасканаласць**, князь Леў Нікалаевіч Мышкін. Гэта ён **ідыёт, адзіны—такі** першапачатковы сэнс гэтага слова. **Адзіны пакуль што,** але ўсе павінны стаць такімі. І стануць—глыбока верыць Дастаеўскі — у будучым шчаслівым грамадстве.

Сапраўдны сэнс гэтых шуканняў вытлумачыў Салтыкоў-Шчэдрын, які ўбачыў у «Ідыёце» сутнасць усёй творчасці Дастаеўскага: «Па глыбіні задумы, — сказаў ён, — па шырыні задач маральнага свету, якія распрацоўвае ён, гэты пісьменнік стаіць у нас зусім асобна. Ён не толькі прызнае законнасць тых інтарэсаў, якія хвалююць сучаснае грамадства, але нават ідзе далей, уступае ў галіну прадбачанняў і прадчуванняў, якія складаюць мэту не непасрэдных, а аддаленых шуканняў чалавецтва».

Аднак, ствараючы ідэал чалавека, які, на думку Дастаеўскага, павінен стаць увасабленнем будучага чалавецтва, любві і справядлівасці, пісьменнік прапаведуе евангельскую пакорлівасць, прапаведуе па сутнасці прымірэнне са злом.

У гэтых страсных пошуках станоўчага ідэалу, такім чынам, выразна адлюстроўвалася драматычная супярэчлівасць светапогляду вялікага пісьменніка.

Апошняе, самае магутнае слова Дастаеўскага—раман «Браты Карамазавы». У тых 12 кнігах, якія напісаны, нараджэнне толькі падрыхтоўваецца, новая істота толькі намечана, увага аддаецца, галоўным чынам, трагедыі адмірання старога жыцця. Імчацца падзеі з незвычайнай хуткасцю, і ў іх імклівым руху ўзнікае мноства рэзка акрэсленых вобразаў—старых знаёмых з ранейшых твораў, але тут паглыбленых, і новых, з розных слаёў, класаў і ўзростаў. І ўсе яны зблыталіся ў адным моцным вузле, асуджаныя на гібель фізічную або духоўную. Тут вастрыня аналізу дасягае крайніх памераў, даходзіць да жорсткасці і пакут.

У прамове пра Пушкіна, сказанай Дастаеўскім незадоўга да смерці, гучыць вера ў вялікія творчыя сілы рускага народа і ў вялікае яго прызначэнне.

Пісьменніка напракалі пры жыцці, папракаюць і да нашых дзён, што ён глядзіць на гісторыю па-славянафільску, супрацьпастаўляе Расію Еўропе. І гэта ў значнай ступені адпавядае сапраўднасці. Але разам з тым Дастаеўскі гаворыць аб іншых народах, што яны «таксама дарагія, як і Расія, як і лёс сваёй роднай зямлі, таму што наш лёс і ёсць сусветнасць, і не мечам хціваці, а сілай братэрства і брацкага імкнення нашага да ўз'яднання людзей».

Многа можна сказаць аб глыбокіх супярэчнасцях Дастаеўскага, аб яго грахах супраць рэвалюцыйных дэмакратаў, аб пропаведзі ім рэлігійнай пакоры і г. д.

Найбольш выразна супярэчнасці Дастаеўскі самому сабе, выступаючы з паклёпам на рэвалюцыйны рух.

У тым-жа артыкуле Салтыкова-Шчэдрына сказана, што Дастаеўскі «сам падрывае сваю справу, выстаўляючы ў гаўнебным выглядзе людзей, намаганні якіх цалкам звернуты ў той самы бок, у які, відавочна, імкнецца і самая запаветная думка аўтара».

Мы адхіляем у творчасці Дастаеўскага яго пропаведзь пакорлівасці, непраціўлення злу, рэлігіі—усё, што ўзнімалі і ўзнімаюць на шчыт рэакцыянеры ўсіх масцей.

Але выказаныя з геніяльнай мастацкай сілай у творчасці Дастаеўскага боль за простага чалавека, любоў да яго, нянавісць да ўсяго, што прымушае яго пакутаваць, і вера ў чалавека, у народ, у ажыццяўленне шчасця на зямлі—усё гэта робіць пісьменніка блізкім нам, робіць яго імя бессмяротным у гісторыі сусветнай культуры.

Прафесар А. ДАЛІНІН.

Спектаклі нашых гасцей

Вялікай падзеяй у культурным жыцці Мінска ў гэтым сезоне з'явіліся гастролі Малога Акадэмічнага тэатра. У свой першы прыезд у кастрычніку 1955 г. тэатр паказаў мінчанам чатыры лепшыя спектаклі свайго рэпертуару: «Васа Жалезнова», «Сэрца не камень», «Шклянка вады» і «Іван Рыбакоў». У другі прыезд гледачы беларускай сталіцы таксама цёпла прынялі спектаклі «Ваўкі і авечкі» А. Остроўскага і «Такія часы!» па п'есе сучаснага польскага пісьменніка Ежы Юрандота.

П'еса напісана ў форме вострай сатырычнай камедыі. На матэрыяле сучаснай рэчаіснасці Польшчы аўтар бязлітасна бічуе перажыткі мінулага ў свядомасці і паводзінах людзей. Адным з найлепшых перажыткаў з'яўляецца мяшчанства, супраць якога і накіраваў меч сваёй сатыры таленавіты драматург.

Дзеянне разгортваецца ў польскім правінцыяльным гарадку Дэмбноўцы. Кола персанажаў абмяжоўваецца некалькімі супрацоўнікамі невялікага завода, які выпускае цвікі. У імклівым развіцці сюжэта, узаемаадносінах звычайных людзей, якія робяць у горадзе звычайныя цвікі, б'ецца пульс новага жыцця працоўных дэмакратычнай Польшчы. У пафасе соцыялістычнай перабудовы краіны, якім прасякнуты твор, заключаны пафас камедыі — пафас стварэння, жыццёсцвярджання. Жывая мова (трэба адзначыць удалы пераклад Ю. Юзэўскага), тонкі народны гумар, свежасць вырашэння тэмы робяць твор Е. Юрандота цікавым для нашага гледача.

Станіслаў Зелінскі — добры дырэктар завода і дастойны чалавек, не здатны на дрэнныя ўчынкі. Як кожны добрасумленны работнік, ён заўсёды сябе аддае справе. Гэта ён узначаліў калектыў рабочых і разам з ім у цяжкім пасляваенным 1946 годзе ўзняў з руін, рэканструяваў і пусціў у ход цвікавы завод. Але дасягнуўшы поспеху, дырэктар самазаспакоіўся, крыху зазнаўся, падпаў пад уплыў жонкі-мяшчанкі. Разам з ёй ён цяпер марыць толькі аб адным: перабрацца ў Варшаву. Зелінскі становіцца перашкодай на шляху рацыяналізатарства рабочых: ён задаволены працэнтам плана і баіцца рызыкаваць — укараніць у вытворчасць новую прапанову старога рабочага Петрыкі.

Але любоў і павага калектыву да свайго дырэктара, у якім рабочыя ўбачылі не варожага чалавека, а сумленнага кіраўніка, умелага арганізатара, акрылілі Зелінскага, адкрылі перад ім новыя, яшчэ больш шырокія прасторы будаўніцтва новага жыцця.

Новыя перспектывы адкрыліся і перад рабочымі завода. Іх захапляе ідэя: не толькі павялічыць выпуск прадукцыі звыш плана на 50 працэнтаў, але і ператварыць глухі Дэмбновец у культурны, прыгожы прамысловы цэнтр, у Новую Гуту — выдатнае дзеціпча соцыялістычнай Польшчы. І ператвораць! Такія часы!

Пастаноўшчык спектакля — народны артыст РСФСР Л. Волкаў, рэжысёр — заслужаны артыст Як. АССР А. Шэрэмец'еў і акцёрскі калектыў стварылі спектакль яркі і жыццерадасны. У імклівым рытме, у дзейсных дыялогах, дзе мова большасці акцёраў гучыць, як добра сыграны музычны ансамбль, адчуваецца вялікая праца, якую ўклалі выканаўцы ў свае ролі.

Калектыў тэатра падышоў да сцэнічнага ўвасаблення камедыі сапраўды творча, даўшы ёй арыгінальнае вырашэнне. Рэжысура пазбегла ў многім той дэкларацыйнасці, якая ёсць у радзе дыялагаў арыгінала. Удзельнікі спектакля стварылі тую атмасферу, у якой працоўныя Польшчы будуюць новае жыццё.

Многа рэжысёрскай выдумкі ў спектаклі. Мізансцэны выразныя, прадыктаваныя ўнутраным станам і паводзінамі персанажаў.

Акцёрскае выкананне вызначаецца ансамблевасцю, высокай культурай мовы, уменнем падаць тэкст без усялякага націску, празмернага падкрэслівання. Акцёры глыбока пранікаюць у сэнс кожнай фразы, кожнага слова, а галоўнае — адносяць гэты сэнс да гледача. Яны любяць і цэняць слова аўтара, даражаць ім. Думаецца, што іменна гэтым тлумачыцца незвычайна шчыльны кантакт акцёраў з глядзельнай залай.

Работа народнага артыста РСФСР Н. Светлавідава над вобразам дырэктара Зелінскага заслугоўвае спецыяльнага аналізу. У ёй шмат цікавага, павучальнага. Самае характэрнае ў творчай манеры таленавітага акцёра — уменне поўнасцю пераўвасабляцца ў вобраз. Гледзячы на гэтага добрадушнага, вельмі рухавага, надзвычай успрымлівага дырэктара — таўстуна ў шэрым гарнітуры, сочачы за яго неспакойнымі вачыма, рухомым тварам і мяккімі, імклівымі жэстамі, пераконваешся, што імейна такі Зелінскі і мог існаваць у сапраўднасці. Вастрыня думак, своеасаблівая манера гаварыць, трымацца натуральна, але неяк насцярожана, з сапраўдным пачуццём спрачацца, пераконваць, сляпая, ледзь не юнацкая закаханасць у жонку, — усё гэта прымушае да канца паверыць у рэальнасць учынкаў Зелінскага, у тое, што адбываецца на сцэне.

Выдатным талентам пераўвасаблення валодае і народная артыстка РСФСР Д. Зеркалава. Вобраз Дароты, жонкі Зелінскага — мяшчанкі да самых касцей, пад дрэнны ўплыў якой трапляе муж, у п'есе вельмі яркі, каларытны. Для выканаўцы — гэта выдатны матэрыял, які дае шмат спакушэнняў да залішняга пераігрывання, штучнага камікавання. Д. Зеркалава іграе ролю Дароты тонка, мякка, эканомна, нідзе не ўпадаючы ў гратэск, у шарж або ў карыкатуру.

П'еса Е. Юрандота і спектакль Малога тэатра хвалюе праўдай характараў. Гэта пацвярджае выкананне сваіх ролей артыстамі П. Оленевым (Петрыка), В. Юрчанкам (Чыжык), Л. Тітовым (бухгалтар Менгажэўскі) і В. Архангельскай (сакратар дырэктара Эля).

Сцэна са спектакля «Такія часы!» Скупень — народны артыст РСФСР І. Любезнаў, Дарота — народная артыстка РСФСР Д. Зеркалава.

Фото І. Салавейчыка.

Пераканальна іграе народны артыст РСФСР І. Любезнаў ролю пісьменніка-стройнага Юліяна Скупеня. Ад прыгожага выгляду Юліяна—Любезнава, яго сімпатычнага, прывабнага твару, павольных, ўпэўненых рухаў, мяккага нізкага голасу — ад усёй гэтай паважнай постаці вее высакароднасцю. У той-жа час у адносінах з Даротай, калі гэтая пані пачынае не на жарт асцерагацца, што Скупень ўпэўнены ў сабе Скупень—Любезнаў — раптоўна новіцца амаль дзіцем—разгубленым, ледзь не ніцым перад напорыстым натоўпам дароты — Зеркалавай.

Нягледзячы на пераканальнасць спектакля, іншыя паводзіны І. Любезнава, іншы ён усё-ж здаецца, што іменна ў выражанні вобраза Скупеня найбольшая слабасць гэтага добрага спектакля. Думаецца, што дадзеным выпадку рэжысёрам і акцёрам здрадзіла пачуццё праўды. Пісьменнік Скупеня добра ведаюць у краіне. Ён напісаў нямала цікавых твораў, сярод іх «Світанне над цаліной».

Але слава стаміла Скупеня, і ён пачынае паводзіць яго прыезд з Варшавы ў Дэмбновец на два-тры дні, на працягу якіх ён думае знайсці аснову для сваёй п'есы. Акалічнасці п'есы Е. Юрандота такіх, што Скупень вельмі самаўпэўнены ў сваіх сілах, пераацэньвае іх і пагарджае неабходнасцю не толькі актыўна і дэтальна вывучаць жыццё, але і ўмешвацца ў яго. Ён упэўнены, што адной-двух гутарак з адным-двума рабочымі яму будзе дастаткова, каб знайсці соцыяльна завостраны канфлікт п'есы. Таму Скупень спяшаецца, не глядзіць спачатку на ўсё бегла. У спектаклі Скупень больш спакойны, ведаючы ўжо ўроўнаважаны, абыякавы. Гэта робіць вобраз ледзь не рэзанёрскім, асабліва спачатку. І калі ў душы гэтага чалавека ад непасрэднага і блізкага сутыкнення з рэчаіснасцю адбываецца пералом, то пачынае не на жарт асцерагацца, што не апынуцца за бортам новага жыцця, адстаць ад яго, — такому перарыш розумам, але не адчуваем... Адбываецца гэта, відаць, з тым, што акцёр не падрыхтаваў гэты момант, недастаткова паказаў вобраз Скупеня ў развіцці.

Поспеху спектакля садзейнічае карацыі мастака Б. Эрдмана. Яны прыгожыя і зручныя для акцёраў, нічога лішняга, што перашкаджае, канаўцам ці засланяла іх. Рэжысёры яны дапамагаюць раскрыццю задумы твора, вызначаюцца, напрыклад, скае выкананне, сваёй прастатой і дзівасцю. Выклікае пярэчанні, на дэталь: неахайна, невыразна, кі абстрактна намаляваны жысцёры ўяўлення аб садзе за акнамі Скупеня.

«Такія часы!» у Малым тэатры дае ўражанне жыццерадаснасці. Шчасце з якога совецкі глядач з цікавасцю даецца аб жыцці працоўнага Польшчы. Будзем спадзявацца, што тэатры Мінска ў хуткім часе ўключаць у рэпертуару краін народнай дружбы, раскажуць нам аб жыцці іншых краін.

А. Дзміт...

ГРОЗНАЯ ЗБРОЯ

Нататкі аб сатыры 1955 года

Звычайна ў новагоднія дні мы чыталі вершы пра сняжынкі, Дзеда Мароза і цудоўную ёлку. Мы так прывыклі да гэтых вершаў, што «Новагодніе слова» Пімена Панчанкі гатовы былі ўспрыняць як парушэнне даўняй паэтычнай традыцыі. У такі ўрачысты момант, калі над ёлкамі выстраіліся зляпленыя з ваты дзяды і зайцы, багатыя святочныя сталы садзіліся людзі, паэт загаварыў раптам аб чымсьці нязвычным:

Не хачу псаваць я людзям свята,
Ды баюся вельмі аднаго:
Каб у тлуме гутарак сяброўскіх,
Тостаў і пахвал пад гучны туш
Не пралезла ў новы год ізноўку
Гніль былая нейчых дробных душ.

Вядома, не вельмі прыемна ў свята гаварыць аб розных «дробных душах», аб «вядучым» вучоным, які «сцёбае каторы год без толку пугаю цытатаў па вадзе», аб... Ды ці мала яшчэ ў жыцці ўсякіх дробных душ, «хамаў, падхалімаў і падліз»? Паэту, усім сэрцам закаханаму ў наша жыццё, зразумела, куды прыемней было-б пісаць аб вялікіх і прыгожых душах, аб слаўных справах, якія здзяйсняе совецкі чалавек — будаўнік комуністычнага грамадства. Але зрабіць інакш ён не мог, як не мог і Владзімір Маякоўскі ў «Гутарцы з таварышам Леніным» не сказаць правадыру, што «дужа багата розных паганцаў ходзяць па нашай зямлі і наўкруг». Не будзе спакойным сумленне мастака, калі ў жыцці ёсць з'явы, якія вымагаюць выкрыцця і асуджання. «Хай і ў новым годзе гэтай мэце служыць верна вастрыё пяра», — такім пажаданнем закончыў П. Панчанка свой верш.

Летась вастрыё пяра многіх нашых пісьменнікаў надрэнна паслужыла бічаванню перажыткаў старога, выкрыццю агідных з'яў, фальшывых і пошлых людзей. Калі ўлічыць, што яшчэ не так даўно мы гаварылі аб сатыры як аб самым занядбаным жанры, дык вынікі мінулага года ў гэтай галіне сапраўды здадуцца суцяшальнымі. Ні ў адзін з папярэдніх гадоў не друкавалася ў нас столькі фельетонаў — вершаваных і празаічных, баек, сатырычных вершаў і апавяданняў, пародый і эпіграм. Сярод іх ёсць і бясспрэчна добрыя творы, якія народ возьме на сваё ўзбраенне.

Плённа працавалі летась байкапісцы Уладзімір Корбан і Эдуард Валасевіч. Да сатыры звярнуліся таксама некаторыя з паэтаў і празаікаў, якія раней не выступалі ў гэтым жанры. Янка Брыль апублікаваў цыкл сатырычных апавяданняў. Увесь год аддаў сатыры Антон Бялевіч. Ён напісаў рад вострых баявых вершаў і фельетонаў, сатырычную паэму «Лёгкі хлеб». Некалькі кароткіх сатырычных апавяданняў надрукаваў Аляксей Кулакоўскі. З вострымі вершамі выступалі Максім Лужанін і Кастусь Кірэенка.

Цяпер сатырычныя творы ахвотней пачалі друкаваць усе газеты і часопісы. А гэта — добрая прыкмета, прыкмета таго, што літаратура стала бліжэй да надзённых патрэб жыцця.

Пашырэнне сатыры — з'ява заканамерная і жаданая. У прывітанні Другому Усесаюзнаму з'езду пісьменнікаў ЦК КПСС заклікаў літаратараў адлюстроўваць ва ўсёй паўнаце і складанасці праўду жыцця, ускрываць сапраўдныя жыццёвыя канфлікты.

«Актыўна падтрымліваючы ўсё новае, перадавое, — гаворыцца ў прывітанні, — якое садзейнічае руху нашага грамадства ўперад, совецкія пісьменнікі павінны з усёй сілай і страснасцю бічаваць перажыткі старога, уласніцкага свету ў свядомасці людзей, бічаваць людзей роўнадушных і косных, дапамагаць вытручваць з нашага жыцця ўсё антыграмадскае і аджыўшае, якое перашкаджае хуткаму росту соцыялістычнай гаспадаркі і культуры».

Сатыра выхоўвае пачуццё нянавісці і высакароднай пагарды да ўсяго агіднага, пошлага, жорсткага. З даўніх часоў яна лічыцца адным з самых моцных сродкаў барацьбы супраць таго, што аджыло ўжо, але яшчэ неяк трымаецца і замінае новаму расці і развівацца. «Ад смеху, — гаварыў А. Герцэн, — падаюць ідалы, падаюць вянкі і аклады, і цудатворная ікона робіцца пачарнелай і дрэнна намаляванай карцінкай». Вялікую, пераўтваральную ролю смеху добра ўсведамлялі Н. Гогаль і М. Салтыкоў-Шчэдрын, А. Чэхаў і М. Горкі, В. Маякоўскі і Д. Бедны. Наследуючы і развіваючы лепшыя традыцыі рускай сатыры, совецкая літаратура стварыла нямала выдатных твораў, знішчальную сілу якіх адчулі на сабе шматлікія ворагі совецкага народа. Заклікаючы пісьменнікаў бічаваць перажыткі старога ў свядомасці людзей, партыя хоча, каб у нас былі поўнацэнныя сатырычныя творы, якія служылі-б магутнай зброяй барацьбы.

Вось гэтую сваю галоўную задачу ажыццяўлялі толькі нямногія творы мінулага года, залічаныя аўтарамі і рэдакцыямі да сатырычнага жанра.

Гаворачы аб сатыры, мы, зразумела, не бярэм пад увагу прымітыўных фельетонаў і баек, у якіх аўтары сяк-так паведамляюць аб злачынстве ці ганебным учынку чалавека і ў заключэнне ўпрошваюць пракурора або народны суд умяшацца ў справу, пакараць злачынцаў. Гэта наогул не сатыра, бо сатыра сама заклікана караць зло і робіць гэта сваімі сродкамі — смехам. Гаворка ідзе аб творах, якія ўзнімаюць сур'ёзныя пытанні жыцця, бічуюць сапраўднае зло, сапраўдныя посьбітаў агіднасцей старога, уласніцкага свету.

А такіх твораў з'явілася не так ужо і многа. Іх магло быць больш, калі-б усе, хто спрабаваў свае сілы ў сатырычным жанры, змаглі глыбей заглянуць у гушчу жыцця, пранікнуць у сутнасць найбольш істотных працэсаў барацьбы новага са старым у совецкай рэчаіснасці. Тады-б у поле зроку некаторых сатырыкаў не трапілі дробныя і неістотныя з'явы, як гэта было, напрыклад, у байках «Звязванне хвастоў» Ул. Корбана, «Вол» М. Скрыпкі ці ў драматычным эцюдзе Л. Вірні «Вылечылі». Сатыра не мірыцца з дробязямі. Гэта — зброя, з якой нельга страляць па вераб'ях. Для некаторых-жа аўтараў мінулы год тым якраз і характэрны, што яны аддалі свае здольнасці і намаганні выкрыццю таго, што ляжала на паверхні.

Калі-б чытачы, скажам, паспрабавалі па сатырычных творах мінулага года меркаваць аб тым, якія заганы і хваробы з'явы прыносяць найбольшую шкоду нашаму грамадству, яны прыйшлі-б да памылковых і, бадай, анекдатычных высноў. Як ні дзіўна, але самая вялікая колькасць фельетонаў, баек, гумарэсак, скетчаў прысвечана... дзецям адказных работнікаў. Напісаны яны па няхітраму штампу і, па сутнасці, вар'іруюць на ўсе лады адзін і той-жа матыў: бацькі аддаюць многа часу службовым абавязкам і не маюць магчымасці належным чынам выхоўваць дзяцей. Вось і растуць яны самапасам, па лес гледзячы, дрэнна вучацца ў школе, станавяцца стылягамі, дэбашырамі. Падобныя з'явы, відома, ёсць, і супраць іх трэба рашуча змагацца. Але-ж наўрад ці яны—тая галоўная жыццёвая праблема, якой неабходна было аддаваць гэтулькі ўвагі. Толькі павярхоўным знаёмствам з жыццём і можна вытлумачыць, што ў сатыры часам з'яўляюцца цалыя касякі твораў, прысвечаных якой-небудзь адной, другараднай тэме. Апроч шкоды, гэта нічога не прынясе, бо ўвага грамадскасці скіроўваецца на дробязі, у бок ад барацьбы супраць таго зла, якое сапраўды сур'ёзна замінае нашаму руху наперад.

Апавяданні Я. Брыля «Субардынацыя» і «Прывал» («Полымя» № 7 за 1955 г.) таму і вылучаюцца з агульнай масы сатырычных твораў, што ў іх гаворка ідзе не аб нейкіх прыватных выпадках, якія толькі на першы погляд могуць здавацца вартымі ўвагі грамадскасці.

Зусім мала падрабязнасцей з жыцця Фамута паведамляе шафёр Будай, герой апавядання «Прывал», а з твора паўстае ясравды тып халоднага, абыякавага да ўсяго, што не датычыць уласнай асобы, чынушы, які адарваўся ад людзей, адгарадзіўся ад свету сценамі свайго кабінета.

«Адзін толькі раз за дзевяць месяцаў трапіў я ў ягоны кабінет, дый то праз клавіну памылку. Спыніўся я, відома, на парозе. «Клікалі, — пытаюся, — Барыс Барысавіч?» Маўчыць. Потым бачу — і ён глядзіць на мяне, і губы варушацца, а нічога не чую... Зразумеў я — далёка. Кранўўся да стала. Ішоў, ішоў, дабраўся да палавіны дывановаў дарожкі і чую: «Паклічце да мяне сакратара!» Ну, пайшоў я без адпачынку назад. Толькі і заўважыў, што стол ягоны, а на стале — чарнільны прыбор. Стол — ну, цэлы, браток Сцяпанавіч, участак, хоць будуйся. А чарнільны прыбор — дзве сіласныя вежы, ды яшчэ на падстаўцы. Драбіны трэба. Ўзлез, абмачыў, злез, падпісаў паперку, аноў палез... Ну, выйшаў я назад у прыёмную, кажу да Клавы: «Што за камедыя? Кліча, Ідзі». А яно маладзенькае, толькі што працаваць пачало. Пайшла, выходзіць з кабінета — чырвоненькая!.. «Выбачайце,—кажа,—таварыш Будай, гэта я памылілася: паслала вас, а яны мне сказалі толькі перадаць вам, што па Лёньку сёння не ў пяць, а ў без пятнаццаці пяць трэба ехаць».

Пры дапамозе скупых, выразных дэталей Я. Брыль стварае сатырычны вобраз. Толькі на хвіліну завіталі мы ў кабінет Фамута, а як глыбока пераканаліся, што гэты чынуша не зможа размаўляць з людзьмі інакш, чым праз свайго сакратара. Сатыры ўласцівы спецыфічныя асаблівасці. Яна патрабуе ад пісьменніка інакшага выбару дэталей, інакшай апрацоўкі слова, чым другія жанры. Не цяжка ўбачыць, як старанна Я. Брыль падбірае іменна такія дэталі, такія словы, якія раскрывалі-б зусім канкрэтны характар бяздушнага чынушы. Фамутавае зарплату». Для яго важнейшы каб падначаленыя атрымоўвалі дакументы праз сакратара. Ён і пазірае «на ўзроўні магазіннай... а, пачуўшы слова падначаленага, вы нават не паверне ў твой бок, а зверху, высока прамармыча нешта... або, вылазячы з машыны, нібы... кажа»...

Апавяданне тым і каштоўнае, што вастрыё сатыры накіравана супраць такой з'явы, імя якой — фамутаўшчына.

З радні Фамуту і Жэнька Лопух («бардынацыя»). Апавяданне вядзе... імя журналіста, з якім Лопух... ваў у партызанах, а пасля працаваў у дакцыі абласной газеты. Мінуў... і яны зноў сустракаюцца. Ужо... слоў гаворыць адзін аднаму, а... адчувае, што апынуліся яны на... розных берагах шырокай, гарадской... лоўнае, халоднай ракі». Лопух... падмяніў. Прывёўшы былога... ра да сябе ва ўстанову, ён... распранулся ў прыёмнай, а... і ў капелюшы ідзе ў кабінет... званком выклікаць сакратара... запрасіць «увайсці». Дэталь... ёмістая. Не менш выразная і... бінеце. Тут Лопух паўстае... велічы:

«Тоўсты і вялы з раптоўнай... му, да смеху важна надзьмуты, ... за пісьмовым сталом і ўжо трымае... перай тоўсты чырвоны аловак. Д... наты ўздзеяння—устаў і паволі, ... крокам выйшаў з-за стала...

— Ну, вось... Здаецца, Алег Пятро...

Ён усміхнуўся, заваловены тым, ... памятае імя не толькі маё, але і ... бацькі...»

«Цяпер ужо даволі салідны таварыш... на даволі адказнай працы»; «... нам... вамі імёны таксама займаюць там адпа... нае месца»; «... Я па сваёй лініі, па... шыся ў апаведных інстанцыях, зр... што палічу магчымым і неабходным...

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Героі і час

Спектакль «Звычайны чалавек» у тэатры імя М. Горкага

П'есу «Звычайны чалавек» Леанід Леонаў напісаў больш дзесяці год назад. Чаму-ж спектакль Дзяржаўнага рускага тэатра па гэтай п'есе гучыць сёння так свежа? Адказ напрошваецца сам сабою: аўтар расказаў аб з'явах нашага жыцця, якія закранаюць і хвалююць сэрцы гледачоў і цяпер. Хвалюе праўда чалавечых характараў, якія раскрываюцца ў вострых сутычках.

Л. Леонаў сабраў у адно месца самых розных людзей. У кватэры і на дачы вядомага опернага артыста Дзмітрыя Ладыгіна сустрэліся людзі, якіх прывялі сюды розныя жыццёвыя шляхі. Прыехаў былы аднапалчанін, з якім ён разам ваяваў у грамадзянскую вайну, прафесар Свеколкін з дачкой Аннушкай. На дзень раней у гэты дом прыехала Канстанцыя—маці Кіры—нявесты Аляксея, племянніка Ладыгіна. У свой час яна «выдала» Кіру за «вядомага» рэжысёра, паквапіўшыся на яго заробкі, а цяпер прыглядаецца да «вядомага» Ладыгіна: ці не «выдаць» Кіру за яго? У ладыгінскім доме ўзнікае складаны пераплёт маральных узаемаадносін. З тонкасцю мастака-хірурга Л. Леонаў аперыруе псіхалагічныя тканкі герояў, выдаляе аджыўшае і аздараўляе іх жыццё. Чытаючы п'есу ці гледзячы спектакль, адчуваеш глыбокі аптымізм пісьменніка, яго веру ў «звычайнага», сумленнага совецкага чалавека, вобраз якога цудоўна ўвасоблены ў героях п'есы Аляксеі, Свеколкіне, Аннушцы.

Іменна яны герої нашага часу. Справа нават не ў касцюмах, пашытых па сённяшняй модзе, у якія апрануў мастак персанажаў п'есы, а ў тых сугучных нашым дням перажываннях і думках герояў, якія вылучаюцца і падкрэсліваюцца рэжысёрам І. Уфімцавым і акцёрамі. Справа ў тым, што і сёння вучоныя шукаюць і знаходзяць прычыны многіх захворванняў, як шукаў іх малады вучоны Аляксей Ладыгін. І ўсё, што дапамагае жыццю совецкіх людзей, будзе цікавіць і хваляваць гледачоў праз шмат год.

Размову аб выканаўцах хочацца пачаць не з тых, чые героі маюць значную ўдзельную вагу ў п'есе, а з тых, хто больш за ўсё запомніўся, усхваляваў, прымусіў задумацца.

Аннушка... Яе вобраз у п'есе намаляваны самымі светлымі, радаснымі фарбамі і па аўтарскай сімпатыі, якой сагрэта гэтая разумная, энергічная і сардэчная дзяўчына, можна беспамылкова сказаць, што яна — любімая гераіня аўтара. Тым не менш Л. Леонаў не робіць яе галоўнай дзеючай асобай п'есы. Яна патрэбна аўтару як светлы пачатак, як выказнік яго аптымістычнай думкі ад перамозе высокіх традыцый сацыялістычнага гуманізма.

Складаныя задачы пастаўлены перад выканаўцай ролі Аннушкі. І трэба сказаць, што гэтая роля ў выкананні Г. Значкоўскай—прыныповая ўдача спектакля.

Ужо з першага з'яўлення на сцэне Аннушка — Значкоўская вабіць сваёй шчырасцю і наіўнасцю, часта выклікаючы сваімі рэплікамі смех, а пазней, у трэцім акце ў сутычцы з Канстанцыяй хвалюе тым драматызмам і гарачнасцю, з якімі яна нападае на тых, хто перашкаджае жыць добрым совецкім людзям.

Тонка, без націску раскрывае Г. Значкоўская складаную і галоўную лінію вобраза Аннушкі—яе юнае каханне да Аляксея Ладыгіна. Нават у тэатральна-ўмоўным эпізодзе з пісьмом да Аляксея Г. Значкоўская застаецца пераканальнай.

Удалае ўвасабленне гэтага вобраза дае [illegible] усяму спектаклю, які гучыць аптымістычна, бадзёра.

[illegible]этаму гучанню садзейнічае і акцёр [illegible] Шрамчанка, які выконвае ролю бацькі [illegible]ушкі—Паўла Свеколкіна. Ў спектаклі [illegible]уніст Свеколкін—чалавек вялікага так[illegible] і розуму, крыштальнага сумлення і [illegible]нцыповасці—стаў цэнтральнай фігурай. [illegible]эта правільна. Жадаючы падкрэсліць [illegible]ычайнасць» Свеколкіна, аўтар не вылу[illegible] яго, пакідаючы на працягу ўсёй п'есы [illegible]доўценю. Свеколкін з'яўляецца толькі ў [illegible]ых кульмінацыйных момантах. Перад [illegible]кысёрам стаяла складаная задача — [illegible]йсці выразныя прыёмы акцёрскай пада[illegible] скупога, лаканічнага матэрыялу гэтай [illegible]і. Акцёрскія магчымасці В. Шрамчанкі [illegible]ыяюць увасабленню аўтарскай задачы і [illegible]кысёрскага вырашэння: Свеколкін — [illegible] Шрамчанка, вонкава непрыкметны, [illegible]чайны чалавек. Яго сапраўды свабодна [illegible]жна прыняць за сціплага касіра, за яко[illegible] спачатку выдае сябе. Толькі ўважлі[illegible]озірк прыжмураных вачэй, прастата і [illegible]ральнасць у абыходжанні з людзьмі, [illegible]зу-ж даюць зразумець, што гэта не [illegible]налавек, за якога прыняў яго недалёкі [illegible]трый Ладыгін.

У радзе сцэн п'есы, дзе Свеколкіну прыходзіцца гаварыць аб прызначэнні чалавека, яго абавязку перад совецкім грамадствам, акцёру вельмі лёгка трапіць у дыдактычны павучальны тон, чаго В. Шрамчанка шчасліва пазбегнуў. Ён пераканальны і праўдзівы, і якраз у гэтых сцэнах яго Свеколкін найбольш ярка раскрывае шырыню сваіх поглядаў і вялікі духоўны свет, уласцівы сапраўднаму комуністу.

Па задуме аўтара Аляксей Ладыгін — той цэнтр, вакол якога разгортваюцца ўсе падзеі, вядуцца спрэчкі. Гэты вобраз акрэслены аўтарам найбольш выразна. У п'есе ёсць выдатны матэрыял, з якога можна стварыць цікавы і значны характар. На жаль Г. Някрасаў, які выконвае ролю маладога Ладыгіна, не змог у пэўнай ступені скарыстаць гэты матэрыял. Яго Аляксей слаба пераконвае нас у сваіх здольнасцях і таленце, і рэплікі навакольных людзей аб гэтым па сутнасці вісяць у паветры. Нават у сцэнах, насычаных сапраўдным драматызмам, як, напрыклад, эпізоды сваркі з Кірай і яе маці, апавядання аб смерці падвопытнай малпы, Някрасаў яшчэ не знайшоў патрэбных інтанацый. Больш цікавы артыст у сцэнах з Дзмітрыем Ладыгіным, але і тут ён часам збіваецца з правільнага тону, спрашчае адносіны з дзядзькам і гэтым самым выдае сваю тактычную бяссільнасць змагацца з ім.

Складаны і шматгранны вобраз Кіры, дзяўчыны са знявечанай душой, якая палымяна ірвецца да светлага жыцця, але яшчэ не можа вырвацца з палону мяшчанства, патрабуе ад артысткі значнай драматычнай насычанасці. У выкананні О. Шах-Парон вобраз Кіры напоўнены такім драматызмам.

Вялікую аўтарскую нагрузку нясе ў спектаклі вобраз Канстанцыі, які ўвасабляе ваяўнічае мяшчанства.

Канстанцыя ў Леонава—страшны чалавек. Вось яе першае з'яўленне: «У пакой важна і сярдзіта ўступае масіўная, з вусікамі і без адзінай сівінкі дама, у капелюшы з былой птушкай і ў пенснэ на даўжэзным шнурку; у руцэ ўмяшчальная сумка з замком, які замыкаецца з такім гукам, нібы перакусваецца косць». Невыпадкова спатрэбілася гэтая рэмарка. Аднак у выкананні Г. Старкоўскай Канстанцыя не адпавядае аўтарскай характарыстыцы. Яна больш мітуслівая, чым салідная, а ў радзе месц, як нам здаецца,—нават добрадушная смешная старая.

Вядома, рэжысура мае права ўносіць нейкія карэктывы ў вобраз, створаны аўтарам п'есы. У дадзеным-жа выпадку І. Уфімцаў проста не дамогся ад артысткі выканання пастаўленых ім задач.

Аўтар дае падставу для шаржыравання вобраза Канстанцыі, бо ён напісаны сатырычнымі фарбамі, і Старкоўская ў радзе месц удала карыстаецца магчымасцямі гратэску. Але артыстцы здраджвае пачуццё меры—яе Канстанцыя рэзка вылучаецца з акружэння, трактаванага строга рэалістычна, з падрабязнай дэталізацыяй.

У п'есе гэты вобраз, нягледзячы на знянавіслывыя і гнеўныя аўтарскія адносіны да яго, чалавечны ў сваіх душэўных праяўленнях. Звернемся да аўтарскай рэмаркі: «Канстанцыя паварочваецца і бачыць дачку. Словы заміраюць у яе на языку; яна становіцца старэнькая, бездапаможная і старамодная. І, забыўшыся пра хустку, яна плача ўжо па-сапраўднаму».

Такой тонкай характэрнасці якраз і няма ў Канстанцыі — Старкоўскай.

Найбольш адпавядае аўтарскай характарыстыцы вобраз Дзмітрыя Ладыгіна ў выкананні С. Дубравіна. Ён іграе лёгка, шчыра, тонка падкрэсліваючы ў характары Ладыгіна тое, што дае прычыну франтавому сябру Свеколкіну сказаць яму проста ў вочы: «А хіба, становячыся артыстам, ты перастаў быць чалавекам, Міця? Ці ты збіраешся цягнуць усю гэтую старызну з сабою, у будучыню?»

Хацелася-б большай творчай свабоды М. Кузьменкі ў ролі жонкі Ладыгіна—Веры Арцем'еўны. У эпізодах, дзе ёй прыходзіцца быць у якасці слухача, артыстка прыкметна выключаецца з агульнага ансамбля, па сутнасці пасіўна прысутнічае на сцэне. Больш удала і правільна выражае М. Кузьменка лінію адносін з Ладыгіным.

Работа мастака В. Кляшчэўскага ў спектаклі здаецца нам шэрай і невыразнай. Па сутнасці афармленне носіць выпадковы характар і хутчэй напамінае так званыя «дзяжурныя дэкарацыі».

У цэлым-жа спектакль «Звычайны чалавек» — удача тэатра і маладога рэжысёра-дэбютанта.

П. ВАСІЛЕЎСКІ.

З замежнай пошты

Спадчына братоў Ганкураў

Характэрная для буржуазнай рэчаіснасці справа разбіралася 12—14 студзеня гэтага года ў адным з парыжскіх судоў. Гутарка ішла аб літаратурнай спадчыне вядомых французскіх пісьменнікаў братоў Ганкураў. Істцом выступаў вядомы пісьменнік Даржэлес, прадстаўнік так званай «Ганкураўскай акадэміі». Адказчыкамі былі мадам Дадэ і яе дзеці—уласнікі літаратурнага архіва пісьменнікаў.

Эдмон Ганкур раптоўна памёр у 1896 годзе (яго брат Жуль памёр значна раней). Абодва браты не мелі дзяцей і блізкіх. Сваю маёмасць яны завяшчалі для стварэння спецыяльных ганкураўскіх штогодніх прэмій. Гэта найбольш вялікія французскія літаратурныя прэміі, якія не раз атрымлівалі і прагрэсіўныя пісьменнікі. Для размеркавання прэмій была створана асобная рада апекуноў з ліку сямі пісьменнікаў, блізкіх Ганкурам, прычым кожны з іх павінен быў назначаць свайго наступніка. Потым гэтая група пісьменнікаў атрымала афіцыйную назву Акадэміі Ганкураў.

Што-ж датычыцца архіваў пісьменнікаў, то яны былі перададзены сябру Эдмона Ганкура — Альфонсу Дадэ, які не здолеў сур'ёзна заняцца імі, бо хутка цяжка захварэў і памёр. Архіў апынуўся ў яго сына Леона Дадэ, які таксама спрабаваў стаць пісьменнікам, але не вельмі ўдала. Аднак ён дабіўся «поспеху» ў іншай галіне. У пачатку бягучага стагоддзя Леон Дадэ, люты манархіст і рэакцыянер, стаў членам парламента.

Пры жыцці Эдмона Ганкура былі надрукаваны толькі першыя часткі дзённікаў Ганкураў, якія з'яўляюцца каштоўнымі запісамі аб палітычным, грамадскім і культурным жыцці Францыі за 40 з лішнім год. Далейшыя кнігі дзённікаў выпускаў ужо Леон Дадэ.

І вось цяпер Акадэміі Ганкураў удалося выявіць, што гэты заўзяты рэакцыянер сістэматычна скажаў дзённікі Ганкураў, не толькі скарачаючы іх, але часам і дапісваючы. Акадэмія Ганкураў прад'явіла ўдаве Леона Дадэ іск з патрабаваннем вярнуць сапраўдныя рукапісы Ганкураў. Акадэмія пры гэтым паведаміла, што яна не хоча парушаць права ўласнасці, але лічыць неабходным пазнаёміць чытача з сапраўднымі дзённікамі пісьменнікаў.

У сувязі з гэтым у газетах друкаваліся выказванні знаўцаў аўтарскага права і прадстаўнікоў літаратурнай грамадскасці. Як быццам выходзіла так, што гаспадар архіва можа рабіць з ім усё, што хоча. Але ці мае ён права скажаць тое, што напісана вядомымі пісьменнікамі, толькі таму, што іх творы сталі яго «ўласнасцю»?. Трэба сказаць, што знайшлося нямала такіх «ахоўнікаў» аўтарскага права, якія, насуперак здаровому сэнсу, сталі на гэты пункт гледжання. І ўсё-ж суд пасля вялікіх хістанняў нарэшце задаволіў іск Акадэміі Ганкураў і дазволіў ёй выдаваць дзённікі па рукапісу аўтараў, не лічачыся з праўкай іх былога гаспадара Леона Дадэ.

Прагрэсіўны друк выказвае задавальненне рашэннем пытання аўтарскага права ў інтарэсах грамадскасці і літаратуры.

„Даследаванні" цемрашалаў

У гэтым годзе ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначае юбілейныя даты вялікіх пісьменнікаў і музыкантаў — Моцарта, Гейнэ, Дастаеўскага, Ібсена, Шоу і іншых. Але ёсць «юбілей», які невядомы шырокім масам совецкіх людзей. Гэта—юбілей цемрашальства. У лютым 1556 года памёр Ігнацій Лайола, стваральнік ордэна езуітаў. І вось дата яго смерці адзначаецца ва ўсіх капіталістычных краінах.

Паводле звестак некаторых французскіх газет, сам папскі прэстол нібыта паставіўся не вельмі прыхільна да гэтага ўслаўлення главы езуіцкага ордэна. Але ў Італіі, Францыі і асабліва ў Іспаніі ёсць людзі, якія лічаць сябе больш католікамі, чым сам папа. Яны рыхтуюцца шырока адзначыць гэты юбілей і напаўняюць кніжныя рынкі езуіцкай літаратурай. Рыхтуецца нават выданне твораў Ігнація Лайолы ў 80-ці тамах. Асабліва ўрачыста мяркуюць адзначыць гэтую дату ў франкісцкай Іспаніі, дзе будуць наладжаны «народныя святкаванні» і запалены «агні святога Ігнація».

Італьянская прагрэсіўная газета «Аванці» ўказвае, што ў сувязі з юбілеем Ігнація Лайолы езуіты праяўляюць асаблівую актыўнасць. Выдаецца вялікая колькасць езуіцкай літаратуры, ад лубачных кніжак да «сур'ёзных» даследаванняў. Нядаўна выйшла двухтомная «Сусветная гісторыя філасофіі» прафесара езуіцкага каледжа Адольфа Рыкі. Выйшла гісторыя італьянскай літаратуры езуіта Антоніо Сікі. Паводле слоў «Аванці», ён «змог у гэтай кніжцы ачарніць усё высакароднае і сумленнае, усё тое, чым ганарацца італьянцы».

Сярод іншых кніг трэба адзначыць — «Езуітызм і сямейная мараль» Адама Сіркі. У сувязі з выданнем гэтай кнігі французская прагрэсіўная газета «Ліберасён» зазначае, што па гэтаму пытанню нельга бадай напісаць нічога новага пасля выдатнага «Тарцюфа» Мальера, бо ў геніяльнай камедыі поўнасцю раскрыты адносіны езуітаў да сямейнай маралі.

Сярод гэтых шматлікіх езуіцкіх «прац» адна кніга заслугоўвае асобнай увагі. Гаворка ідзе аб «даследаванні» французскага езуіта Анры Шамбра «Марксізм у Совецкім Саюзе».

Кніга Шамбра—гэта важкі том у 800 старонак. У ёй прыведзена вялікая колькасць дакументаў, дэкрэтаў, пастаноў, заканадаўчых актаў, выдадзеных за час існавання совецкай улады. Паводле сведчання прагрэсіўнага французскага філосафа Коена, гэта—у большасці сваёй не фальсіфікаваныя матэрыялы, але імі святы айцец езуіт аперыруе па-свойму, надзвычай спрытна. Самае цікавае, што ў гэтай антысовецкай кніжцы няма прамых антысовецкіх выпадаў. Шамбр дзейнічае па-езуіцку, г. зн. прыкідваецца другам Совецкай краіны. Ён толькі імкнецца даказаць, што, маўляў, совецкая ўлада адышла ад марксізма і варожая цяпер гэтаму вучэнню. Езуіт у ролі абаронцы марксізма — незвычайнае відовішча. Коен у сваім артыкуле паказаў, як Шамбр дзейнічае прыёмамі «вопытнага шулера, які ўмее па-жульніцку іграць «знямечанымі картамі». Напрыклад, спрытна скарыстоўваючы совецкія дакументы, Шамбр спрабуе даказаць, што марксізм—гэта вучэнне, якое ставіць у аснову ўсяго нібыта адну эканоміку. А цяпер совецкая ўлада адмовілася быццам ад марксізма, бо надае вялікую ўвагу не толькі эканоміцы, але і культуры. Нямала такіх «адкрыццяў» ёсць у гэтай кнізе. У ёй, паводле слоў Коена, невядома, чаго больш,—ашуканства, каварства ці невуцтва.

Барацьбе з езуітамі прысвечана новая цікавая кніга італьянскага літаратуразнаўцы Альфонса Ларо «Слова ў барацьбе з езуітызмам». У гэтай кнізе паказана, як на працягу многіх стагоддзяў перадавыя пісьменнікі, публіцысты, мастакі і нават дзеячы каталіцкай царквы ўпарта змагаліся з езуітамі, выкрывалі іх, імкнуліся вырваць з іх рук народную асвету, паказаць шырокім масам бяздонне ашуканства і цемрашальства езуітаў. Цікава адзначыць, што ў гэтай кнізе прыведзены даволі вялікі спіс актыўных барацьбітоў з езуітамі, іх ахвяр, пачынаючы ад папулярнага французскага пісьменніка Еўгенія Сю, які, як цяпер удалося дакладна высветліць, быў атручаны езуітамі ў Швейцарыі, і да украінскага совецкага пісьменніка Яраслава Галана, забітага наймітамі езуітаў.

І. БАРЫСАЎ.

З любоўю да працы

Дзесяць год Якуб Сікорскі нязменна працуе лістаносцам у сельскагаспадарчай арцелі «Калгаснік Беларусі» Старадарожскага раёна.

Вось ён, гэты пажылы ўжо чалавек, з поўнай сумкай вяртаецца з паштовага аддзялення ў сваю вёску Боркі і не прамінае ніводнага двара.

— Хадзячы кніжны магазін! — часта жартуюць аднавяскоўцы.

Яны памятаюць, як ранняй вясной мінулага года Якуб Сікорскі прыйшоў у праўленне калгаса.

— Дайце мне спіс звеннявых, што будуць вырошчваць кукурузу, — папрасіў ён.

Ужо назаўтра лістаносец пабываў у кожнага з іх у хаце. І кожны купіў для сябе брашуру па агратэхніцы кукурузы.

За дзесяць год у яго не было выпадку, каб хто-небудзь з калгаснікаў застаўся без газеты ці кнігі.

К. САНКЕВІЧ.

Алесь СТАХОВІЧ

Смерць дачасна вырвала з нашых радоў Алеся Стаховіча — таленавітага празаіка, аўтара раду шырока вядомых як у рэспубліцы, так і за яе межамі твораў. Беларуская совецкая літаратура страціла аднаго са сваіх актыўных дзеячоў, пяро якога заўсёды служыла партыі, народу.

Аляксандр Іосіфавіч Стаховіч нарадзіўся ў 1907 годзе ў сям'і селяніна-бедняка в. Кашына Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. У 1923 годзе ўступіў у рады ЛКСМБ, а ў 1927 годзе — у рады Комуністычнай партыі. Вылучаны затым на партыйную работу, А. І. Стаховіч працаваў у райкомах партыі ў Крупках, Талачыне, Жлобіне, у палітаддзелах соўгасаў Горкі-Апчак і Старчыцы, а пазней — інструктарам ЦК КПБ.

У гады Вялікай Айчыннай вайны пісьменнік супрацоўнічаў у армейскім друку.

Першыя літаратурныя творы А. І. Стаховіча з'явіліся ў 1928—1929 гг. у газеце «Звязда». З таго часу яго творы сістаматычна друкуюцца на старонках газет і часопісаў і выдаюцца асобнымі кніжкамі (зборнік апавяданняў «Маленькія героі»—1939 год, аповесць «Пампей Шчупак» — 1940 год, аповесць «Шумяць лясы» — 1944 год, зборнік апавяданняў «Неспакойны гарадок» — 1946 год).

У пасляваенныя гады А. І. Стаховіч напісаў рад твораў, прысвечаных мірнай стваральнай працы беларускага народа. Найбольш вядомыя з іх — раманы «Пад мірным небам» і «Шырокія гарызонты», перакладзеныя на рускую, польскую, венгерскую і іншыя мовы.

Да апошніх дзён пісьменнік працаваў над новымі творамі, уважліва вывучаючы жыццё, каб увасобіць яго ў мастацкіх вобразах.

А. І. Стаховіч узнагароджаны ордэнам Чырвонай Звязды, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Светлая памяць аб Алесю Стаховічу, таленавітым пісьменніку і цудоўным таварышу, назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Якуб Колас, Э. Агняцвет, П. Броўка, К. Буслаў, Я. Брыль, В. Барысенка, П. Глебка, І. Гурскі, І. Гутараў, В. Вітка, В. Вольскі, А. Васілевіч, А. Есакоў, А. Зарыцкі, О. Здаравенін, М. Калачынскі, У. Карпаў, К. Кірэенка, Г. Кісялёў, К. Крапіва, П. Кавалёў, У. Краўчанка, А. Кулакоўскі, А. Куляшоў, А. Кучар, П. Ладыжын, М. Лынькоў, М. Ларчанка, У. Луцэвіч, М. Лужанін, П. Лютаровіч, А. Макаёнак, З. Матузаў, С. Майхровіч, Я. Маўр, І. Мележ, А. Міронаў, В. Позняк, П. Панчанка, М. Паслядовіч, П. Пестрак, В. Пыжкоў, М. Садковіч, М. Танк, М. Ткачоў, Е. Уралава, В. Фесько, Т. Хадкевіч, І. Шамякін, І. Шарахоўскі, У. Шахавец, Г. Шчарбатаў, А. Якімовіч.

Жалобнае развітанне

9 лютага пісьменнікі і грамадскасць Мінска праводзілі ў апошні шлях таленавітага беларускага пісьменніка Алеся Стаховіча.

У 12 гадзін ля труны, якая была ўстаноўлена ў зале пасяджэнняў Саюза пісьменнікаў БССР, сталі на ганаровую варту П. Броўка, І. Шамякін, М. Калачынскі, І. Мележ.

Гучыць жалобны марш. На ганаровай варце змяняюцца пісьменнікі, журналісты, прадстаўнікі Акадэміі навук БССР, студэнты і выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, педагагічнага інстытута, артысты тэатраў сталіцы, блізкія і сябры нябожчыка.

У 14 гадзін 30 мінут пачынаецца грамадзянская паніхіда.

Ад Саюза пісьменнікаў выступаюць В. Вольскі, І. Шамякін, А. Міронаў, ад Міністэрства культуры БССР—Я. Рамановіч, ад рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия»—Г. Таран. Прамоўцы гавораць аб творчай і грамадскай дзейнасці А. Стаховіча, якая не спынялася да апошняга дня, аб яго маральнай чысціні і высокай партыйнай прынцыповасці ў творчасці і жыцці, аб яго таварыскай чуласці.

На могілках на жалобным мітынгу выступіў Алесь Якімовіч. Ён ахарактарызаваў творчы і жыццёвы шлях А. Стаховіча, вернага сына партыі і народа, які ўсё сваё жыццё — і сваімі творамі і непасрэднай практычнай дзейнасцю — служыў вялікай справе комунізма.

На кніжнай паліцы

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай і музычнай літаратуры:

Дзяржаўны гімн Беларускай ССР. Словы М. Клімковіча. Музыка Н. Сакалоўскага. Тыраж 10 тысяч экз., стар. 4. Цана 25 кап.

Янка Брыль. На Быстранцы. Тыраж 10 тысяч экз., стар. 228. Цана 4 руб.

Дэкада беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве 11—21 лютага 1955 года. (Зборнік матэрыялаў). Тыраж 3 тысячы экз., стар. 404. Цана 18 руб. 55 кап.

М. Е. Салтыкоў-Шчэдрын. Паны Галаўлёвы. Пераклад В. Віткі. Тыраж 5 тысяч экз., стар. 292. Цана 6 руб. 10 кап.

Анатолій Іваноў. На Далёкім Усходзе. Раман. На рускай мове. Тыраж 50 тысяч экз., стар. 388. Цана 8 руб.

Р. Пукст. Пяць танцаў для фартэпіяно з оперы «Марынка». Тыраж 1 тысяча экз., стар. 24. Цана 2 руб. 50 кап.

Д. Камінскі. Канцэрт № 1. Пераладжэнне для двух фартэпіяно. Тыраж 200 экз., стар. 116. Цана 15 руб.

Р. Пукст. Верасы. Для скрыпкі і фартэпіяно. Тыраж 1 тысяча экз., стар. 8. Цана 1 руб. 30 кап.

М. Чуркін. Песні для дзяцей. На словы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, Я. Журбы, А. Русака, Э. Агняцвет. Тыраж 1 тысяча экз., стар. 48. Цана 2 руб.

Р. Пукст. Ой, бору мой. Для голасу з фартэпіяно. Ляцела зязюля. Для хору. Словы народныя. Тыраж 1 тысяча экз., стар. 12. Цана 1 руб. 10 кап.

ГРОЗНАЯ ЗБРОЯ

(Заканчэнне).

[illegible]хаеш гэтага «вяршыцеля лёсу», якому [illegible] хапае толькі ўсесаюзнай вядомасці», і [illegible]аеш: як-жа далёкі ён ад таго, чым жы[illegible]цяпер народ, што хвалюе ўсіх совецкіх [illegible]зей, Лопухі, на жаль, яшчэ ёсць у на[illegible] жыцці. Пісьменнік злосна высмеяў [illegible]амнасць такіх дробных душ, як Фа[illegible] і Лопух, абудзіўшы ў нас пачуццё [illegible]арды да іх. А гэтага і павінен дамагац[illegible] сатырык.

[illegible]ажныя пытанні ўзнімаюцца ў некато[illegible]к сатырычных апавяданнях А. Кулакоўскага. У «Ружовай канапцы» («Во[illegible]к» № 11 за 1955 г.) высмейваюцца [illegible]анныя метады кіраўніцтва калгасамі. [illegible]уацыя ў апавяданні жывая, востра ка[illegible]ная. Раніцай да старшыні калгаса [illegible]кіёнка, які сабраўся ехаць у поле, [illegible]ўляецца інструктар райкома партыі па [illegible]е МТС, за ім інструктар райкома ком[illegible]мола, потым намеснік старшыні райвы[illegible]нкома і, нарэшце, прадстаўнік абласт[illegible]праўлення сельскай гаспадаркі. Іх [illegible]мя[illegible] ці ўсё ў парадку ў плане сяўбы [illegible]ы. Пераканаўшыся, што да плана [illegible]капаешся, яны адпускаюць стар[illegible]а самі саддзяцца на канапцы гу[illegible] шахматы. Назаўтра ўвечары, вяр[illegible]ся з поля, старшыня паслаў коню[illegible]едацца, ці ёсць хто ў канцылярыі. [illegible]ецца, там сядзела ўжо чалавек [illegible] розных прадстаўнікоў. Досвіткам [illegible]шыня з конюхам аднеслі ружовую ка[illegible]напку на кормакухню. Такая фельетонная [illegible]канцоўка пашкодзіла апавяданню. Пісь[illegible]меннік не выкарыстаў магчымасцей, якія [illegible]давала яму абраная сітуацыя, для востра[illegible]га бічавання недахопаў у кіраўніцтве кал[illegible]гасамі, не ўзняўся да мастацкага абагуль[illegible]нення. Таму ў апавяданні не адчуваецца гнеўнай сілы смеху, а расказанае выглядае прыватным, нязначным фактам.

«На самай справе, — пісаў М. Салтыкоў-Шчэдрын, — для таго, каб сатыра была сапраўднай сатырай і дасягала сваёй мэты, трэба, па-першае, каб яна давала адчуць чытачу той ідэал, ад якога адштурхоўваецца яе творца, і, па-другое, каб яна зусім выразна ўсведамляла той прадмет, супраць якога накіравана яе джала».

Паасобным нашым сатырыкам бракуе жыццёвага і мастацкага вопыту, з прычыны чаго яны часам не могуць узняць у сваіх творах пытанняў, якія сапраўды хвалююць грамадства, не дасягаюць глыбокіх, праўдзівых абагульненняў з'яў, аб якіх пішуць. У гэтым пераконвае нас другое апавяданне А. Кулакоўскага — «Аднойчы раніцай» («Вожык» № 15 за 1955 г.). Цяжка зразумець, у імя чаго напісаны твор. Калі верыць аўтару, герой апавядання інструктар райкома партыі Іван Хоміч б'ецца над вырашэннем пытання: як яму захаваць сваю поўную незалежнасць ад старшыні калгаса, ад брыгадзіраў, ад усіх калгаснікаў. «Што зрабіць, каб можна было не моргаючы глядзець кожнаму ў вочы і гаварыць з кожным так, як вымагаюць абставіны? Не простая гэта справа, хоць збоку, магчыма, і здаецца простай».

Што-ж прымусіла інструктара райкома партыі задумацца над такім пытаннем? У калгасе не ўстала двое коней. Высветлілася, што іх звярэдзілі ўночы, возячы колле на агарожу Хомічу. Сам ён нічога аб гэтым не ведаў: жонка ўпрасіла брыгадзіра. І вось Хоміч, сумленны работнік, як характарызуе яго аўтар, шукае адказу на сваё пытанне. А праблема, дзеля якой напісаны твор, надуманая, штучная, бо чалавеку, які ніколі не браў чужога, не жыў за кошт грамадскага дабра, нават у галаву не прыйдзе такое пытанне. Аб жонцы-ж Хоміч не думае, не асуджае яе ўчынку. Вобраз героя — няпэўны, няясны.

На нашу думку, і А. Бялевіч не зусім выразна ўсвядоміў сутнасць той грамадскай з'явы, супраць якой накіраваў вастрыё сатыры ў паэме «Лёгкі хлеб» («Полымя» № 12 за 1955 г.). Ён ганьбуе людзей, якія пагнаўшыся за лёгкім хлебам, цураюцца працы, становяцца паразітамі. Такая Любка — галоўная гераіня твора. Вясковая дзяўчына, якая змалку ўведала вартасць цяжкога хлеба, трапіўшы ў горад, у мяшчанскую сям'ю Сыча, хутка пераараджаецца, пачынае жыць «на ўвесь кар'ер», прыстроіўшыся да важнага туза.

У паэме ёсць мясціны, напісаныя моцна, па-майстэрску, асабліва тыя, дзе выкрываецца пошласць мяшчанскага побыту. Звяртаюць на сябе ўвагу яркія партрэтныя характарыстыкі персанажаў, багатая, па-народнаму вобразная мова.

Цалкам-жа задаволіць нас паэма не можа. Не пераконвае яна ў той частцы, дзе гаворыцца аб прычынах пераараджэння Любкі. Няўжо для дзяўчыны з працоўнай сям'і, якая рана пазнала асалоду працы, для студэнткі, захопленай любімай справай, дастаткова будзе літаральна некалькіх салодкіх слоў цёткі-мяшчанкі аб лёгкім хлебе, каб яна кінула ўсё і зажыла «кароўкай божаю»?

У паэме-ж усё адбываецца іменна так.

Да Любкі цётка з «ласкаю»:
— Грызеш навуку? Плюнь!
Гуляй, цвіці ты краскаю,
А кнігі ў стол засунь.
... Есць з дачаю багатаю
Начальнік у Сыча.
Табе яго пасватаю,
Хвядоса Кузьміча...

І Любка адраклася ад сваіх ранейшых імкненняў, ідэалаў. «На лёгкі хлеб ёй хочацца. Багатага-б знайсці!» «Ой, скора як, ой, скоранька працоўны хлеб забыт!»—дакарае гераіню аўтар. Занадта наіўна, просталінейна паказана яе пераараджэнне. Мы не бачым тых рэальных жыццёвых абставін, якія сапраўды маглі-б абумовіць такую карэнную ломку характару гераіні.

Гэтак-жа лёгка адбываецца і яе перавыхаванне. Дастаткова было Любцы зноў трапіць у вёску, глянуць на мазолістыя рукі калгаснікаў, сустрэцца з былой сяброўкай,—як яна адчула сябе вялікай грэшніцай, убачыла марнасць, нікчэмнасць свайго жыцця. «Магла-ж так жыць, як Леначка... Ну, так, як людзі ўсе...» — з болем у душы думае Любка. Жывая логіка развіцця характару гераіні не высветлена. Таму ўсё агіднае ў яе ўчынках, супраць чаго так горача выступае паэт, выглядае нейкай лёгкай забаўкай, не ўзбуджае абурэння, пагарды. Насуперак жаданню аўтара, паэма падводзіць чытача да фальшывай думкі: быццам горад разбэшчвае людзей, спакушае іх лёгкім хлебам. Думка гэтая ўзнікае з самога апавядання пра падзенне і ўваскрошанне галоўнай гераіні. Яе-ж выказвае старая звеннявая Агата, убачыўшы Любку:

Такая-ж, нібы шпулечка,
Дачка ў мяне была.
Цяпер — ого! Кукулечка! —
На лёгкі хлеб сплыла.

Было-б несправядліва сцвярджаць, быццам іменна з гэтай думкі зыходзіў аўтар, прыступаючы да працы над паэмай. Аднак бясспрэчна: адсутнасць яснай, дакладна акрэсленай задумы, адсутнасць выразнай пазіцыі прывялі да таго, што добрыя і шчырыя намеры паэта засталіся нядзейснымі. Вострая адчуваецца яшчэ адзін недахоп: у паэме, названай у падзагалоўку сатырычнай, няма гнеўнага, знішчальнага смеху аўтара. Яна пазбаўлена галоўнай якасці, неабходнай кожнаму сатырычнаму твору.

Між іншым, самі сатырыкі нярэдка недаацэньваюць значэння сваёй зброі. Многа ў мінулым годзе друкавалася баек, фельетонаў, сатырычных апавяданняў, не здольных абудзіць у чытача нават лёгкую ўсмешку. І вельмі мала было такіх твораў, дзе іскрыўся-б бадзёры, здаровы смех над заганамі і недахопамі, якія аўтар намерыўся зганьбаваць. Возьмем, напрыклад, байку «Тры сям'і» Ул. Корбана («Вожык» № 14 за 1955 г.). У ёй занатоўваецца побыт трох сямей. У Звадкіных — штодзень грызня, лямантаванне. У Жмотавых — «няма таго і звання», хаця суседзі і не ведаюць, што там таксама пануюць нелады. А вось у Шчыравых жывецца зусім інакш: лад, згода. Што-ж, усякія бываюць на свеце сем'і, — толькі і падумаем мы, прачытаўшы байку. Але-ж гэта было вядома і раней. Дзе-ж гнеўны смех байкапісца, які знішчаў-бы пошлае, агіднае ў побыце некаторых совецкіх людзей? Не адчуваем мы гэтага смеху і ў байцы Э. Валасевіча «Певень-лавелас» («Вожык» № 18 за 1955 г.). Аўтар прыдумаў даволі пікантную сітуацыю. Селянін купіў пеўня, ды такога, што «аж зіхаціць, гарыць, нібы агонь». Замест таго, каб сумленна глядзець «сваёй курынай світы», певень стаў заляцацца да гускі з суседняга двара. Невядома, да якіх вынікаў прывёў-бы раман гускі і пеўня, калі-б той не патрапіў на закуску суседаваму Тарзану. Толькі ў падобных байках і можна сустрэць неверагодныя, далёкія ад элементарнай праўдападобнасці «гісторыйкі». Твор пазбаўлены алегарычнасці: ніводзін сапраўдны лавелас не падумае, што гэта яго меў на ўвазе байкапісец.

Захапленне алегорыямі,